СЯРГЕЙ
АБЛАМЕЙКА



# EGOІЗМЫ

Vostraja Brama
НАША НІВА
2004

Vostraja Brama
2004

СЯРГЕЙ
АБЛАМЕЙКА

# EGOІЗМЫ

Vostraja Brama
НАША НІВА
Вільня
2004

ISBN 9955-437-19-7
UDK 882.6(437.1/.2)-8
Ab-53

**Сяргей Абламейка.**
***Eg*oізмы. Канстатацыі.** — «Наша Ніва»
(Бібліятэка «Вострая Брама», 6). — 2004. 224 с.

*Рэдактар* **Сяргей Дубавец**
*Мастак* **Генадзь Мацур**
*Макет* **Віктар Корзун**

© Сяргей Абламейка, 2004
© Генадзь Мацур, 2004
© «Наша Ніва», 2004

## Зьмест

*Васіль Быкаў. Прадмова,* **7**

MODUS VIVENDI – *ЛАД ЖЫЦЬЦЯ,* **9**

FILUM VITAE – *НІТКА ЖЫЦЬЦЯ,* **65**

RATIO VIVENDI – *СЭНС ЖЫЦЬЦЯ,* **137**

VITA ARTIUM – *МАСТАЦКАЕ ЖЫЦЬЦЁ,* **161**

VITA PUBLICA – *ГРАМАДЗКАЕ ЖЫЦЬЦЁ,* **183**

VITA TACITA – *МАЎКЛІВАЕ ЖЫЦЬЦЁ,* **211**

ULTIMA RATIO – *АПОШНІ АРГУМЭНТ,* **217**

*Індэкс паняткаў,* **219**

Гэта — унівэрсальная кніга чалавечай (хрысьціянскай, але ня толькі) маралі, побыту і жыцьцёвай мудрасьці, якая ахоплівае ці ня ўсе бакі людзкога існаваньня.

Вядома, што наша грамадзтва шмат дзесяцігодзьдзяў было пазбаўлена маральных набыткаў, выхоўвалася ў звыродлівых умовах камуністычнай псэўдадэмакратыі — па сутнасьці, амаральным чынам. Пільная неабходнасьць спасьціжэньня чалавечага досьведу і боскай мудрасьці, вольных ад татальнай камунізацыі людзкой сьвядомасьці, была відавочнай. Каб упісацца ў сучасны эўрапейскі маральны кантэкст, найперш трэба яго спасьцігнуць.

Аўтар зрабіў вялікую справу, так ці інакш асэнсаваўшы шматзначную складанасьць чалавечага жыцьця, зь якога ён утварыў высновы — лякалічныя і ёмістыя сэнтэнцыі, багатыя значэньнем і

сэнсам. Не зважаючы на ўяўную даступнасьць, кнігу трэба чытаць нетаропка, з роздумам, як бы ўпершыню асэнсоўваючы кожны паварот лёгікі прапанаванага афарызму. Тады ён адкрыецца вам ва ўсёй глыбіні свае мудрасьці.

Добра, што сабраныя ў кнізе сэнтэнцыі ў бальшыні сваёй пазбаўленыя спрошчанай павучальнасьці, сумнеўнай навуковасьці, выкладзеныя даступна для разуменьня, добрай беларускай мовай. У прамежках між імі яны як бы запрашаюць чытача да роздуму ў паўзах, часам, можа, не выключаючы і нязгоды ў высновах ці фармулёўках. Тое пераважна там, дзе сэнс прэтэндуе на залішнюю катэгарычнасьць або ўнівэрсальнасьць сьцьверджаньня.

Маральны пагляд аўтара, часам бязьлітасны да чалавечай экзыстэнцыі, можа нават шакаваць. Але ўвогуле тое абгрунтавана, калі мець на ўвазе перажыты грамадзтвам час і набыты ім досьвед. Пракляты той досьвед яшчэ доўга будзе аказваць свой уплыў на ўсе бакі нашага існаваньня. Філязофія і мараль — у тым не выключэньне.

Прапанаваную аўтарам сыстэматызацыю кнігі трэба лічыць умоўнай. Улічваючы рознабаковасьць і ўнівэрсалізм зьместу, дамагацца дасканаласьці яе структуры, мабыць, было б залішнім клопатам. Нязробленае аўтарам можа зьдзейсьніць чытач адпаведна ўласным поглядам і густам.

Галоўнае, што гэтая кніга — добрая і патрэбная для нашага грамадзтва, якое спрадвеку імкнецца зразумець сусьвет. Але чалавеку ў гэтай бязьмерна складанай справе найперш трэба зразумець сябе.

*Васіль Быкаў*

# MODUS VIVENDI

# *лад жыцьця*

## ЖЫЦЬЦЁ

. . .

Дзе б вы ні спыніліся, вы заўсёды станеце ў некага на дарозе.

. . .

Сэнс і бессэнсоўнасьць жыцьця злучаюцца ў боль па ім.

. . .

Трагічнага ў нашым жыцьці значна больш, чым мы ад яго чакаем і гатовыя прыняць.

. . .

Ведаць сваю будучыню ня дадзена нікому. Ствараць сваю будучыню — дадзена ўсім.

. . .

Жыцьцё — гэта мастацтва лавіраваць сярод гаўна.

. . .

Кажуць, палітыка — брудная справа. Ці разумеюць яны, што ўсё наша жыцьцё — палітыка?

. . .

Мала хто хоча задаволіцца малым, але большасьці — давядзецца.

. . .

Як добра магло б скласьціся нашае жыцьцё, калі б мы яшчэ дзецьмі ведалі, што людзі ня толькі памыляюцца, але й ня хочуць нічога ведаць аб гэтым.

І якімі разумнымі мы былі б, калі б загадзя ведалі, што людзей ня толькі ня трэба клікаць пад свае сьцягі, але й самім нам ня трэба ўставаць пад чыесьці...

. . .

Сутыкненьне інтарэсаў трэба было б назваць жыцьцём, а супадзеньне інтарэсаў — сяброўствам ці каханьнем.

. . .

Добра было б, калі б мы яшчэ ў маладосьці разумелі, што да нас нікому няма

справы. А калі й ёсьць, дык часьцей для таго, каб зрабіць сваю справу за наш кошт.

• • •

Чым менш спадзявацца ад жыцьця, тым большым уявіцца тое, што ад яго атрымаем.

• • •

У кожнага з нас — свае ўзьлёты. І ва ўсіх — адна памылка: мы чакаем вяршыні тады, калі стаім на ёй...

• • •

Больш за ўсё мы памятаем і шкадуем аб тым, чаго хацелі, але гэтак і не атрымалі.

• • •

Перш чым выказаць думку, добра падумайце, ці сапраўды цікавіцца вашым меркаваньнем той, да каго вы зьвернецеся.

• • •

Самае неабходнае ў жыцьці чалавека — спакой. Пры гэтым тыя, хто яго мае, усяляк імкнуцца яго пазбыцца.

. . .

Чаму ён няшчасны, хай кожны запытае ў сябе.

. . .

Гэта няпраўда, што існуе нейкая сусьветная энтрапія, якая ўраўнаважвае посьпехі і няўдачы кожнага. Але кожны асабіста павінен быць да гэтага гатовы.

. . .

Нехта нечага ўсё жыцьцё хоча, а нехта гэта ўсё жыцьцё робіць. Розьніца.

. . .

Для пасьпяховага жыцьця трэба значна менш адукацыі, чым некаторыя маюць.

. . .

Ня хочаце ісьці наперад — пойдзеце назад.

. . .

Хаос вакол нас — уяўны. Насамрэч усё рухаецца наперад.

. . .

Дабрыня да патрэбных людзей прыносіць страты.

. . .

Часьцей пытайце ў сябе, што застанецца па вас пасьля сьмерці. Гэта дапаможа вам пазбавіцца ад некаторых жарсьцяў і надасьць жыцьцю новы сэнс. Калі пасьля вас застануцца добрыя дзеці — гэта ня горшы варыянт.

. . .

Спыняцца і азірацца карысна. Бо пасьля азіраньня можа аказацца, што "перад" стаў бокам альбо й задам.

. . .

Ня ўсе ведаюць, куды ісьці. Таму тыя, хто ведае — карысныя для іншых. Бяда, што і першым, і другім уласьціва памыляцца: адзін не туды вядзе, другі не за тым ідзе.

. . .

Чым хутчэй кожны зразумее, што ён — адзін, тым лепш і для яго, і для навакольных.

. . .

Фатальнае спрацоўвае і дзейнічае менавіта там, дзе нам ня трэба і дзе мы яго менш за ўсё чакаем. Таму мы і называем яго фатальным.

. . .

Умацоўвацца трэба не для таго, каб быць мацнейшым за ўсіх, але для таго, каб у патрэбным месцы і часе стаць мацнейшым за астатніх.

. . .

Хто хаваецца ў кусты, той там і застаецца.

. . .

Праблемаў значна больш, чымся людзей, здольных іх вырашаць.

. . .

Мары замінаюць будаваць рэчаіснасьць.

. . .

Той, хто не ўважае сябе больш вартым за іншых, лягчэй стрывае перамогу менш вартага.

. . .

Перамагае ня той, хто мае рацыю, але той... хто перамагае.

. . .

Нам заўсёды нечага не хапае, і менавіта таму мы рухаемся наперад. Шукаем нястачу.

. . .

Сыйшоўшы напаўдарозе з дыстанцыі, мы пазбаўляем сябе ня толькі радасьці перамогі, але й прыкрасьці паразы.

. . .

Не забывайце пра сябе. Асабліва тады, калі з усіх бакоў вас да гэтага заахвочваюць тыя, хто не забывае пра сябе.

. . .

Не забывайце пра сябе і тады, калі з усіх бакоў навакольныя заклікаюць вас не забыцца пра іх.

. . .

Небясьпекі бываюць гэткія нечаканыя і вычварныя, што нават асьцярожныя і прадбачлівыя людзі здагадваюцца пра іх, калі ўжо позна.

. . .

Як лёгка ра́дзіць і як цяжка пара́дзіць!

. . .

Пляны бываюць зьдзяйсьняльныя і не. І гэта залежыць не ад плянаў, але ад таго, хто іх выконвае.

. . .

Пачуцьцё бясьпекі часьцей за ўсё падманлівае і таму — небясьпечнае.

. . .

Калі вам нехта сеў на галаву — адмоўцеся ўдаваць фатэль.

. . .

Прыкра, але мы патрэбныя тады, калі патрэбныя.

. . .

Паміраюць усе бяз розьніцы. Затое жывуць — з розьніцай.

. . .

Выйсьці знаходзяцца з усіх сытуацыяў. Проста знойдзенае выйсьце не аднаўляе страчаных магчымасьцяў.

. . .

Калі вас выкарыстоўвае мярзотнік, значыць, вы дазваляеце яму гэта рабіць.

. . .

Мы моцна памыляемся, калі ня хочам назваць сёньняшні дзень жыцьцём, а дазваляем гэтак звацца толькі ўчору і заўтру.

. . .

Праспаўшы час прыняцьця рашэньняў, мы вымушаныя прымаць лекі.

. . .

Як часта мы не разумеем, ад каго сапраўды залежыць наш лёс, і як проста тлумачацца многія складанасьці нашага жыцьця!

. . .

Не чакайце, што вас убачыць той, хто бачыць толькі сябе. Гэта ж датычыць і вашых праблемаў.

. . .

Толькі самыя імпэтныя ды адчайныя паддаюцца імгненнаму інтарэсу на шкоду інтарэсу сталаму. Але адвярніся ад нас фартуна, пакінь нас наш анёл-апякун, здарся з намі бяда, — і што тады той доўгатрывалы інтарэс? Мы ўсё жыцьцё пасьля будзем успамінаць інтарэс імгненны і тое, як удала мы яму паддаліся. Чалавек жыве сёньня і марнуе сябе сёньня ж. Шчасьлівы той, хто знайшоў балянс паміж імгненным і вечным.

. . .

Незайздросная доля таго, хто сваю долю паставіў у залежнасьць ад чужой апініі.

. . .

Бывае, мы вельмі добра робім зь першага разу, і псуем пасьля, пачынаючы папраўляць.

. . .

Як часта мы шкадуем аб тым, што некалі рабілі, не шкадуючы сілаў!

. . .

Як часта жыцьцё сутыкае нас з цынічнымі асобамі, якія паводзяцца з намі паводле старога прынцыпу: "І б'юць, і плакаць не даюць..."

. . .

Недаробленае — можна дарабіць, а вось нязробленае — часта пачынаць ужо няма сэнсу.

. . .

Як горача мы, бывае, чакаем падтрымкі ад таго, хто, як і мы, разумее прадмет нашага абурэньня ці асуджэньня. І як наіўна пасьля зьдзіўляемся, калі замест падтрымкі чуем кан'юнктурную пахвальбу таму, што крытыкуем. Разумець і гаварыць аб гэтым — розныя рэчы.

. . .

Мы псуем сабе жыцьцё не тады, калі крочым па ім, але тады, калі выбіраем свой шлях.

. . .

Як часта мы шкадуем рэчы і не шкадуем дзеля іх сябе!

. . .

Цяжэй дапамагчы таму, хто сам вінаваты.

. . .

Адзін робіць сабе імя і грошы, а другі робіць сабе тое самае на ім.

. . .

Падзеі, часам, ня трэба аналізаваць. У іх трэба браць удзел.

. . .

Віну нельга выкупіць. Зробленае ёсьць зробленае. Лепш да віны справу не даводзіць.

. . .

Мы заўжды не гатовыя да расплаты.

. . .

Дэманстраваць свае пачуцьці — неразумна.

. . .

Цяжка і сказаць, што лепш: задавальненьне ці незадаволенасьць. І тое, і тое маюць свае перавагі...

. . .

Цяжка быць ва ўсім вінаватым. Яшчэ цяжэй ня быць вінаватым у кожнай з праблемаў свайго жыцьця.

. . .

Кожны з нас дасягае ў жыцьці кропкі, адкуль ёсьць шмат шляхоў: наперад і назад, да добрага і злога, да ўдачы і паразы... І многія, замест таго, каб вырашыць, куды пайсьці, шукаюць, дзе там прысесьці.

. . .

Сказаць "не магу" значна прасьцей, чым зрабіць.

. . .

Спадзявацца можна ня толькі на сябе. А вось пакладацца трэба толькі на сябе.

. . .

Ніхто ня можа быць гатовым да ўсяго, а здараецца якраз усё.

. . .

Як выжыць не за кошт іншых у сытуацыі, дзе ўсе выжыць ня могуць?

. . .

Як часта мы імкнемся ў залатую клетку, а трапіўшы туды, пачынаем тужыць па волі. Калі ж дзьверы раптам адчыняюцца, мы разумеем, што з клеткі ня хочам...

. . .

Прыстойным трэба было б ведаць ад пачатку, што нахабы ня толькі не расплочваюцца за зробленае, але й прабачэньня не заўсёды просяць.

. . .

У жыцьці — як у натоўпе: калі ўпаў, старайся ўзьняцца сам. Рукі могуць так і не падаць.

. . .

Драпежнік зьядае слабога — унівэрсальны прынцып жыцьця, які дзейнічае і сёньня, і нават у царкве.

. . .

Як гэта ні парадаксальна гучыць, але мы часам бываем неасьцярожна асьцярожныя.

. . .

Ня бойцеся казаць вядомыя рэчы. Яны могуць быць невядомыя таму, хто вас слухае.

. . .

Мы імкнемся да вяршыні, забываючы, што яна — канец шляху (і кар'еры). Далей шляху няма.

. . .

Кожны з нас павінен быць гатовы да таго, што ўрэшце ягоныя заслугі будуць пастаўленыя ў заслугу іншым.

. . .

Будучы перакананымі, што ў нас усё наперадзе, мы не заўважаем, як яно застаецца ззаду.

. . .

Сапраўдная прычына таго, што адбываецца, заўсёды больш цынічная, чым мы думаем.

## СТАРАСЬЦЬ І МАЛАДОСЬЦЬ

. . .

Успамін аб маленстве шчыміць душу і сэрца, бадай, не таму, што мы хочам быць

маладзейшымі, а таму, што мама і бацька былі тады моцнымі, маладымі й прыгожымі.

...

Спрадвечную супярэчнасьць паміж новым і старым ілюструем мы самі. Мы не разумеем старых, будучы маладымі, і мы ж не разумеем маладых, стаўшы старымі.

...

Незалежную дзяржаву складаюць незалежныя людзі, а цывілізаваную — незалежныя старыя.

...

Пражыўшы доўгае жыцьцё, людзі ўсё роўна баяцца сьмерці, бо спадзяюцца, што хоць нешта з таго, па чым яны тужаць, — вернецца.

...

Сумна, калі людзі пад старасьць не разумеюць таго, што павінны былі б зразумець у маладосьці. І яшчэ горш, калі мы можам сказаць гэта пра сябе.

...

Вярніце старому хоць нешта з таго,

што ён страціў, — і гэтую вашую ласку дацэняць нябёсы.

...

Старасьць — ня толькі доля кожнага. Яна яшчэ й прыходзіць значна хутчэй, чым чакае той, хто яе не шануе.

...

Люблю назіраць. Малады хоча заняць нейкае становішча з дапамогай старога. Сядзяць у кампаніі іншых. Малады лісьлівіць і дагаджае старому страшэнна і ведае, што хлусіць. Стары млее ад улешчанага самалюбства і пры гэтым таксама ведае, што малады хлусіць. І што цікава: малады вельмі проста і хутка дамагаецца свайго.

...

Не судзіце моцна старога. Проста пастарайцеся ўратаваць супольную справу.

...

Старых трэба шанаваць. Пры гэтым іх трэба добра ведаць. А родных старых — трэба любіць.

...

Любеце старых, калі хочаце, каб любілі вас...

. . .

Адзінота — не абавязковая спадарожніца старасьці, але найбольш распаўсюджаная.

. . .

Не стварайце старым праблемы. Ім і так цяжка змагацца з цэлым сьветам.

. . .

Не прапусьціце момант, калі станеце старымі самі. Звычайна ён супадае з момантам, калі вы ня толькі пачынаеце дбаць выключна пра сябе, але й хочаце, каб тое ж рабілі вашыя блізкія.

. . .

Расчараваньні часта называюць юнацкімі. Я б сказаў, што яны — непазьбежныя спадарожнікі сталасьці, а таксама — яе прычына й перадумова.

. . .

Мяжу паміж маладосьцю душы і інфантылізмам мы павінны праводзіць самі. Крый Божа, каб гэта рабілі за нас іншыя. Зь дзяцінства ў старасьць, мінуючы сталасьць, — вось шлях тых, хто ня можа разьмежаваць у сабе маладое ды інфантыльнае.

. . .

Калі побач з вамі сталы чалавек пачынае *"А памятаеш..."*, не перашкаджайце яму вярнуцца думкамі ў маладосьць. Пройдзе колькі гадоў — і вярнуцца думкамі ў мінуласьць захочацца ўжо вам.

. . .

Юр, часта, — гэта нежаданьне прызнаць сябе старым.

. . .

Годна старэць дапамагае плён.

. . .

Сьмеючыся са старых, мы дэманструем сваю непадрыхтаванасьць да таго часу, калі пачнуць сьмяяцца з нас.

. . .

Злое ў старых — вынік ня іх старасьці, але іх маладосьці.

. . .

Адно зь нямногага, што трэба шкадаваць — маладосьць. Калі яна ёсьць — добра. Ня страшна й калі яе ўжо няма. Кепска — калі яна сыходзіць у цябе на вачах: шкада прыгажосьці.

. . .

Перш чым плянаваць сваю старасьць, дажывеце да яе.

. . .

Бывае так, што стары чалавек, добра ўсьвядоміўшы свае памылкі, схіляе да іх маладога... Ніхто ня хоча заставацца самотным.

. . .

З гадамі ўзрастае асьцярожнасьць, якая ў маладосьці здаецца нерашучасьцю і непатрэбным кампрамісам.

. . .

Людзям сярэдняга веку ня трэба было б пераймацца з прычыны блізкае старасьці. Палова жыцьця — ня ёсьць паловаю сьвядомага жыцьця.

. . .

На людзей пачынаюць забывацца раней, чым яны адыходзяць.

. . .

Той, хто паразумеецца з восеньню, павінен паразумецца і са старасьцю, хоць лета ўсім шкада аднолькава...

. . .

Для некаторых з нас старасьць зьяўляецца тым, на што можна спаслацца, калі мы ня хочам нечага рабіць.

. . .

Ня ўсё новае добрае, як і ня ўсё старое — кепскае.

. . .

Не забудзьмася, што ўсё старое некалі было маладым і новым.

. . .

Больш за ўсё пад старасьць нам помсьцяць незрэалізаваныя памкненьні й жаданьні, і яны ж часам ратуюць нас ад пекла.

. . .

Асьцярожнасьць ня толькі дапамагае, але й шкодзіць. Прычым асабліва пасьпяхова яна робіць гэта, калі спыняе ня словы, але ўчынкі, і ня ў сталыя гады, але ў маладосьці.

. . .

Малады чалавек адрозьніваецца ад немаладога... формаю падбародзьдзя.

. . .

Чым даўжэй жывеш, тым меней сабе падабаесься. Зьнешне.

. . .

Чым даўжэй жывеш, тым больш кепскіх навінаў даведваесься пра сябе.

. . .

Сваю старасьць мы заўважаем на аднагодках.

. . .

Ёсьць адно пачуцьцё, якому ня можа спачуваць маладая палова чалавецтва — гэта вострае адчуваньне блізкае старасьці і кароткасьці жыцьця.

## СІЛА І СЛАБАСЬЦЬ

. . .

Крыніцаю сілы ёсьць жаданьне. Крыніцаю слабасьці — задавальненьне.

. . .

У адносінах паміж сабой людзі больш выяўляюць свае слабасьці, чым сілу.

. . .

Калі нехта крытыкуе чужую сла-

басьць, гэта зусім не азначае, што ён моцны. Наадварот, гэта можа азначаць, што ён яшчэ слабейшы.

...

Загану нельга зьмяніць. Можна зьмяніць заганнага чалавека. Але і ў гэтым выпадку мала ў каго хопіць... любові да заганнага.

...

Калі нехта кажа, што даўно і пасьпяхова змагаецца са сваім недахопам, можна не сумнявацца, што ён будзе змагацца зь ім яшчэ столькі ж.

...

Слабасьць — ня ёсьць апраўданьне.

## СЯБРЫ І ВОРАГІ

...

З узростам чалавек шмат што набывае — вопыт, веды, кантакты, грошы... Але вельмі рэдка — новых сяброў.

...

Калі мы сумуем па сябрах маленства — мы не разумеем, што сумуем па

чысьціні ў адносінах. Дзеці ня дзеляць сьвет, яго дзеляць дарослыя.

. . .

Сяброўства, звычайна, канчаецца тады, калі трэба выбіраць паміж сабой і сябрам.

. . .

Дасягненьні не спрыяюць сяброўству.

. . .

Шчасьлівы той, хто ў 40 гадоў сябруе з тымі ж людзьмі, з кім сябраваў у 20.

. . .

Для кожнага можа надысьці час, калі ён сябруе з тым, хто сябруе зь ім.

. . .

Шчасьлівы той, хто сябруе з тым, з кім хоча.

. . .

У кожнага з нас ёсьць толькі адзін сапраўдны сябар, які ніколі ня здрадзіць. Гэта — ён сам.

. . .

І навязьлівага сяброўства ня трэба ад-

кідаць. Што, калі яно здаецца такім толькі вам?

...

Той, хто мае шмат сяброў, звычайна ня мае ніводнага сапраўднага.

...

Сярод нас нямала такіх, каго адсутнасьць сяброў і няздольнасьць сябраваць прымушаюць кожнага знаёмца называць сябрам.

...

Як часта мы знаходзім ворагаў там, дзе шукаем сяброў!

## КАХАНЬНЕ

...

Колькі жанчынаў сталі нашымі ў нашым уяўленьні? Магчыма, столькі, колькі іх пашкадавала ў думках аб нашай нерашучасьці...

...

Шкада, што няшчаснае каханьне больш доўгае і трывалае, чым шчаслівае.

...

Не дамагайцеся таго, хто вас ня хоча. Ён вас так і не захоча.

...

Калі нельга інакш, можна кахаць і вачыма.

...

Палюбоўных раманаў паміж людзьмі, якія сымпатызуюць адно аднаму, магло б быць значна больш, каб не... лянота.

...

Колькі жарсьцяў у нашым жыцьці спараджае рэўнасьць! Гэта тым больш дзіўна, што ў пераважнай большасьці выпадкаў яна — беспадстаўная.

...

Каханая жанчына — каханая і на раніцу.

...

Добра пра жанчынаў ня скажа той, хто не кахаў.

...

Каханьне — доля дасканалых. Больш простыя кіруюцца жарсьцямі. Але ёсьць

паміж двума гэтымі пачуцьцямі і яшчэ адна мяжа — маладосьць.

. . .

Жарсьць і каханьне — розныя рэчы. Жарсьць падпарадкоўвае вас свайму аб'екту, кідае да ягоных ног. Каханьне — ураўноўвае.

. . .

Аднабаковаму каханьню наканавана ператварыцца ў жарсьць.

. . .

Жарсьць, сама будучы залежнасьцю ад свайго аб'екту, спараджае і нашую залежнасьць ад сябе.

. . .

Адносіны паміж двума — таямніца Божая, паміж трыма — таямніца д'ябла.

. . .

У шлюбнай здрадзе бяруць удзел чацьвёра.

. . .

Каханьне — фэтыш.

. . .

Безнадзейна закаханым магло б дапамагчы ўсьведамленьне таго, што мы таксама — сысуны, і, апрача высокіх памкненьняў, кіруемся таксама зусім жывёльнымі рэчамі, напрыклад... пахамі.

. . .

Розум каханьню не памочнік.

. . .

Жаданьне быць падманутым — не апошні складнік каханьня.

. . .

Некаторыя раўніўцы ня могуць зразумець, што адзіны іхны канкурэнт — яны самі.

. . .

Людзі часта і самі не разумеюць, што аб'ект іхнага каханьня насамрэч зьяўляецца ўсяго толькі суб'ектам дасягненьня іх мары або сродкам рэалізацыі іхнай жа амбіцыі.

. . .

Сапраўдны мужчына — гэта той, хто можа ганарыцца сваёй жонкай, а не сваімі палюбоўніцамі.

## ПОСЬПЕХ І НЯЎДАЧА

. . .

Своечасова зразумець — вось посьпех у жыцьці! Большасьць бо разумее, калі ўжо позна...

. . .

Посьпеху на зямлі значна менш, чым людзей.

. . .

Беспадстаўным мы звычайна называем чужы посьпех.

. . .

Часам для посьпеху дастаткова вельмі добра думаць... аб сабе.

. . .

Мы заўсёды больш вінаватыя ў сваіх няўдачах, чым гатовыя гэта прызнаць.

. . .

Нельга сказаць, што ўдача заўсёды ўзносіць на вяршыню нявартых. Значна часьцей яна ўзносіць на вяршыню таго, каго ўважаем нявартым мы.

. . .

Свае посьпехі мы часьцей называем провідам Божым, чым свае няўдачы.

. . .

Адзін з нашых закідаў пасьпяховым — няўвага да нашае пэрсоны. Закід няслушны. Той, хто рухаецца наперад, — наперад і глядзіць.

. . .

Адна з перадумоваў посьпеху — навучыцца адмаўляць.

. . .

Посьпех і здрада — вось два спрадвечныя спадарожнікі!

. . .

Гісторыя посьпеху часта — гэта гісторыя прастытуцыі.

. . .

Прыстойнасьць і посьпех — рэчы часта не сумяшчальныя. Таму з асаблівай скрухай я назіраю ў некаторых прыстойных гатоўнасьць стаць пасьпяховымі.

. . .

Вяршыня посьпеху тым вышэйшая,

чым ніжэй чалавек згодны ўпасьці дзеля яе.

Усё вырашае ўзровень амбіцыі.

...

Некаторыя з нас, наракаючы на няўдачы, не разумеюць, што яны папросту занадта прыстойныя для посьпеху.

...

Наракаючы на няўдачы, мы часта проста не разумеем, што тое, чаго мы ня робім, абавязкова зробіць нехта іншы.

...

Калі людзі пачынаюць дзяліць посьпех, тады канчаюцца сяброўства і шчырасьць паміж імі.

...

Чым хутчэй малады чалавек пераканаецца, што ён ня самы лепшы і ня самы разумны, тым большая верагоднасьць, што зь яго нешта атрымаецца. І парадокс. Якраз тыя, хто ўважае сябе лепшым за астатніх, часьцей за ўсё дамагаюцца посьпеху і нешта ствараюць у гэтым жыцьці.

. . .

Удача расьпешчаная людзьмі. Яе чакаюць усе, і таму яна такая пераборлівая.

. . .

Бессаромнасьць, вядома, больш пасьпяховая за сарамлівасьць. З другога боку, ня кожнаму патрэбны бессаромны посьпех. Тут праблемы няма. Праблема ў тым, ці бывае посьпех сарамлівым?

. . .

Як часта мы памыляемся адно ў адным! І як цяжка глядзець на посьпех таго, у станоўчых якасьцях каго не сумняецца ніхто, а ты не сумняесься ў ягонай прыроднай заганнасьці.

. . .

Непрыстойныя і пасьпяховыя часам прыносяць праблемаў менш, чым напалову прыстойныя і напалову пасьпяховыя. Першыя бо не падманваюць надзеяў.

. . .

Хацець — мала. Трэба яшчэ магчы. Але й гэтага мала. Трэба, каб і першае, і другое супалі ў часе і, адначасова, у іншых — якраз разышліся.

. . .

І здольнасьці, і розум, і веда, і шанцунак — важныя для посьпеху ў жыцьці, але не галоўныя. Галоўнае тут, на жаль, — гатовасьць скінуць з дарогі перашкоду. Ці то бервяно, ці то чалавека, няважна.

. . .

Большасьці няўдачнікаў для посьпеху не хапае ўсяго аднае "драбязы" — цынізму.

. . .

Адны людзі дамагаюцца посьпеху, іншыя сабе яго прыдумляюць. А ёсьць і такія, хто намагаецца прыдумаць пасьпяховае тлумачэньне сваёй няўдачы.

. . .

Амаль заўсёды асуджаныя на няўдачу тыя, хто павольна думае.

. . .

Пазіраць на посьпехі іншых некаторым з нас лягчэй, чым самім паспрабаваць ды прайграць.

. . .

Тыя, хто забывае на сябе дзеля іншых

— менш пасьпяховыя. Затое яны лепшыя і прыгажэйшыя.

. . .

Параза канкурэнта паляпшае сон і апэтыт. Яна можа таксама дадаць вам новага сябра. Па няшчасьці.

. . .

Радасьць за посьпех суседа прыносіць нам плён на нябёсах. Затое сам пасьпяховы можа вельмі хутка, яшчэ на зямлі, прынесьці нам нешта... адваротнае радасьці.

. . .

Аб посьпеху мараць няўдалыя. Астатнія яго маюць.

. . .

Няўдачы ня ўсіх людзей псуюць. Шмат каго яны робяць лепшымі, а некаторых — ратуюць.

. . .

Наракаючы на няўдачу, не забудзься, што пройдзе час, і яна можа аказацца найвялікшым шанцункам.

. . .

Большы посьпех чакае вас у тым выпадку, калі вы не імкняцеся рэалізоўваць ідэі адразу пасьля іх прыходу ў галаву.

. . .

Бывае, што посьпех хутчэй знойдзеш не на дарозе самасьцьвярджэньня, але на шляху самавыраЧэньня. Таму і назіраем мы вакол састарэлых эгаістаў, якія сьцьвярджаюць сябе нават у шараговых сытуацыях і ў пабытовай драбязе.

. . .

Для посьпеху справы часта хапае слова. Тлумачэньні бываюць лішнімі.

. . .

Пакуль вы не зразумееце, што атачаныя колам пасьпяховае пасрэднасьці, вы асуджаныя на няпосьпех.

. . .

Звычайна, калі мы разумеем, што ж трэба для посьпеху, нам самім ставацца пасьпяховымі ўжо позна...

. . .

Раньні посьпех рана і закончыцца.

...

Посьпеху бяз працы не бывае, а працы бяз посьпеху — шмат.

...

Той, хто ня любіць рызыкаваць, не даможацца вялікіх посьпехаў. Але й няўдачнікам ня стане.

...

Абмежаванасьць інтарэсаў і зацікаўленьняў хутчэй прыводзяць да посьпеху, чым іх шырыня. У абмежаванасьці мэты больш дасягальныя.

...

Для посьпеху чалавеку патрэбны мінімум прымітыўнасьці.

...

Абмежаванасьць і прымітыўнасьць не зьяўляюцца падставамі для няпосьпеху.

...

Самазадаволены ёлупень — ня самы рэдкі тып сярод тых, каму шанцуе.

...

Калі нам пачынае здавацца, што мы больш вартыя і таленавітыя за іншых —

гэта верная прыкмета таго, што мы трапілі ў паласу няўдач.

. . .

Стрымаць сябе ў патрэбны момант — часта палова посьпеху.

. . .

Хто знае далікатна дагадзіць, улесьціць, — той ведае жыцьцё. Але гэтая веда не абавязкова вядзе да посьпеху. Яна можа быць і вынікам няўдачы.

. . .

Кароткі розум — доўгі язык. Гэта абавязкова. Затое зусім неабавязкова: доўгі язык — кароткі сьпіс удачаў і посьпехаў.

. . .

Добра было б яшчэ зь дзяцінства ведаць, што нашыя посьпехі разам з намі могуць узрадаваць толькі нашых сваякоў...

. . .

У адным толькі выпадку наш посьпех можа ўзрадаваць ня толькі нас і нашых сваякоў — калі ён можа разглядацца і як посьпех усяго народу ці краіны.

## ПЕРАМОГА

. . .

Пераможцы звычайна са зьдзіўленьнем даведваюцца, колькі ў іх было саюзьнікаў і паплечнікаў у часе барацьбы...

. . .

Шмат хто з нас далучаецца да справы. Некаторыя ж далучаюцца і да гонару за яе.

. . .

За прысвойваньне чужых грошай садзяць у турму, а за прысвойваньне чужых заслугаў — не.

. . .

Ня толькі дробным людзям уласьціва перабольшваць свае перамогі.

. . .

Перамагае не заўсёды мацнейшы. Назіральнікаў жа цікавіць не мацнейшы, але пераможца.

. . .

Змогшы сябе, чалавек набывае самапавагу. Пры гэтым ня важна, у якой справе ці галіне яму выпала сябе змагчы: у

творчасьці, здароўі ці крадзяжы. Самапавага, пакліканая перамогай, ува ўсіх выпадках — аднолькавая.

...

Сьцеражыся баязьліўцаў. Яны нападаюць першыя і з-за гэтага часта выйграюць.

## ШЧАСЬЦЕ

...

Калі б на зямлі было шчасьце, дык навошта тады быў бы рай?

...

Усе ідуць да шчасьця. Ня ўсе да яго даходзяць.

...

Шчасьце не пазбаўляе нас ад жаданьняў.

...

Пакінь думкі аб няшчасьці, калі ты здаровы і жывы.

...

Каб жаданьні супадалі з магчы-

масьцямі! Ці было б тады ў людзей шчасьце? І ці ня ёсьць шчасьце тым, чым ёсьць, менавіта таму, што яно ў кожным пэрсанальным выпадку больш жаданае, чым магчымае, больш нечаканае, чым заслужанае?

...

Якім шчасьлівым бывае чалавек, калі ня ведае...

## РАЦЫЯ

...

Мае рацыю той, хто зразумеў, што яна нікому не патрэбная.

...

У сьвеце шмат хто ня мае рацыі. І нармальна жыве...

...

Неразумна даводзіць людзям іхную нярацыю. Думаць пра вас ад гэтага лепш ня стануць.

...

Большасьць людзей блытае перакананасьць у сваёй рацыі... з рацыяй.

. . .

Праблемы прыходзяць за памылкамі. А за рацыяй, адпаведна, павінны былі б прыходзіць удача і посьпех. У жыцьці ж бывае, што выявіць сваю рацыю, вельмі часта, — памыліцца. Пра сваю трэба, прынамсі да часу, маўчаць.

. . .

Людзі, якія ніколі ня маюць рацыі, раздражняюць гэтаксама, як і тыя, што яе заўсёды маюць. Альбо прывыклі мець.

. . .

Калі вы апэлюеце да паважных рэчаў перад чалавекам, ад якога неяк залежыце, мусіце ведаць, што амаль заўсёды абсалютная, на вашую думку, рацыя будзе для яго неперacанаўчаю. Вашыя праблемы — гэта толькі вашыя праблемы.

. . .

Праўда, справядлівасьць — гэта рацыя. Але сьвет чалавечых імкненьняў — ірацыянальны, і калі ёсьць у ім нейкая рацыя, дык яна заўсёды ня наша...

. . .

Як камічна, бывае, некаторыя з нас адкідаюць развагі аб рацыі-нярацыі. Пасьпець бы ўгнацца за моцным! І далучыцца.

. . .

Ёсьць нейкі мінімальны ўзровень, пачынаючы зь якога чалавека можна зьмяніць. Ніжэй яго — зьмены немагчымыя. Мяжа, праз якую праходзіць гэты ўзровень, — хаця б аднакратнае прызнаньне сваёй нярацыі.

. . .

Трэба прызнаць, што чалавечая рацыя — бліжэй да рэальнай выгады, чым да абстрактнай справядлівасьці.

. . .

Чужая рацыя не прымаецца намі не таму, што — рацыя ці нярацыя, але таму, што — чужая.

. . .

Некаторыя людзі заўсёды маюць рацыю толькі таму, што ў той момант яны так думаюць.

. . .

Чаму тыя, хто мае права, думаюць, што яны яшчэ й маюць рацыю?

. . .

Сіла перамагае рацыю.

## ЗДРАДА

. . .

Падставаю здрады можа быць баязьлівасьць, а можа — і сьмеласьць, пры гэтым у абодвух выпадках не абыйдзецца без эгаізму.

. . .

Калі нехта запабегліва зазірае вам у вочы, ён можа вас здрадзіць.

. . .

Здраднік бывае верны толькі адной сваёй звычцы — здраджваць.

. . .

Людзі часта па-ханжаску ставяцца да тых, хто здраджвае мужу ці жонцы. Такіх асуджаюць пераважна таму, што самі гэтага адно хочуць, а тыя, каго судзяць, — гэта робяць.

. . .

Здраднік радзімы, справы ці жонкі — чалавек рашучы. Рашучасьць — вартая павагі якасьць. Затое вынік здрады, як і яе матывы, павагі не выклікае.

. . .

У пачатку здрадніцтва часта ляжыць

факт першай здрады, у якім здраднік пасьля цэлае жыцьцё ня хоча прызнацца, і ўсе далейшыя здрады — толькі апраўданьне ці хаваньне першай.

## НАІЎ

...

Наіўны той, хто не разумее, што ягоныя прэтэнзіі да бліжняга не прымаюцца з той самай прычыны, зь якой і ўзьнікаюць.

...

Наіўныя таму і наіўныя, што не разумеюць гэтага ў патрэбны момант.

...

Калі ведаць, што большасьць жаданьняў — ня споўніцца, дык чалавек будзе выглядаць яшчэ большым наіўцам.

...

Наіўная шчырасьць і дабрыня вельмі часта бываюць прычынаю кепскага характару. Зрабіўшы людзям добрую рэч, мы злуемся і крыўдуем, калі яны гэтага не дацэньваюць, бо забываем, што нас аб гэтым і не прасілі.

. . .

Той, хто і ў пяцьдзесят гадоў наіўны, як у дваццаць, — напэўна, такі самы бедны, як тады.

. . .

Добрая і чыстая рэч, — наіўнасьць, дапамагае людзям фармавацца — і пачынае помсьціць тым зь іх, хто не зразумеў яе ўрокаў і пад старасьць.

. . .

Калі я сустракаю чалавека, які кажа, што ўсё зразумеў, я думаю, колькі яму, беднаму, яшчэ належыць зразумець...

## ПРАЎДА І СПРАВЯДЛІВАСЬЦЬ

. . .

Праўда не заўсёды на нашым баку. Але ў тым, што яна павінна там быць, мы перакананыя з моманту, як пачалі сябе ўсьведамляць.

. . .

Самым справядлівым мы называем тое, што пасуе менавіта нам.

. . .

Справядлівасьць — рэч настолькі рэд-

кая, што мы часта ня можам яе знайсьці нават сярод сваякоў. Што ж шукаць яе сярод чужых?

...

Справядлівасьць можна шукаць, але нельга знайсьці.

...

Ёсьць выпадкі, калі трэба казаць толькі частку праўды. Не дагаворваць — ня хлусіць.

...

У нашым сьвеце праўды значна менш, чым няпраўды. Таму й людзей, якія шукаюць праўды, непараўнана менш, чым тых, хто яе не шукае... А можа й наадварот.

...

Парада праўдалюбцам: не шукайце таго, што патрэбна толькі вам.

...

Праўду можа ўспрыняць і вытрываць толькі моцны розумам і духам. Падтрымліваць у ілжывай думцы трэба слабога.

...

Мала шанцаў на посьпех у таго, хто заўсёды на баку праўды.

# МАЎЧАНЬНЕ І БАЛБАТНЯ

...

Гаварыць — ня значыць расказваць. Ня ўсе гэта разумеюць.

...

Калі вам часам здаецца, што маўчаньне — золата, вы памыляецеся. Маўчаньне — заўсёды золата.

...

Мы наракаем на доўгі язык, а мусілі б — на дурную галаву...

...

Самы карысны замок — на вуснах.

...

Памылкова думаць, што ў адным чалавеку могуць спалучацца розум і балбатлівасьць.

...

Амаль заўсёды лепш не дагаварыць нешта важнае, чым сказаць залішняе.

...

Журналісты — гэта аматары паплят-карыць на тэму сваіх зацікаўленьняў.

. . .

Дайце зайздросьліваму плеткару інфармацыю — і вы народзіце паклёпніка і інтрыгана. Пазбаўце яго інфармацыі — і ён ператворыцца ў кволага, абыякавага і безабароннага хвалька і хлуса.

. . .

Давяраеш людзям ці не давяраеш, галоўнае — менш гавары.

. . .

Маўчаньне мае, пераважна, дзьве прычыны — розум таго, хто маўчыць, альбо яго дурноту. У першым выпадку чалавек маўчыць, бо ўжо ня мае што сказаць. У другім — яшчэ ня мае.

. . .

Некаторыя з нас свае думкі захоўваюць на канцы языка. Часам думка ўжо сказаная, а галава толькі пасьля дадумваецца, што гаварыць можа і ня варта было.

. . .

Большасьць з нас хавае, каб сказаць.

. . .

Ня ўсё з таго, што прыходзіць нам у галаву, павінна зь яе выходзіць.

. . .

Ня ўсё з таго, што хочацца, трэба гаварыць, як і ня ўсё з таго, што гаворыцца, — хочацца.

## КРЫЎДА

. . .

Як у кожным жарце ёсьць доля праўды, гэтак і ў кожнай крыўдзе ёсьць доля прызнаньня сваёй віны.

. . .

Асабліва безабаронны перад крыўдамі той, хто ўсё жыцьцё іх робіць іншым.

. . .

Як часта на нас крыўдуюць за тое, у чым мы не вінаватыя. І як часта тыя, хто крыўдуе, вінаватыя ў гэтым самі.

. . .

Ня бойцеся пакрыўдзіць навакольных. Усё роўна нехта пакрыўдзіцца.

. . .

Пакінь старыя крыўды. Калі табе ў гэты момант радыя, цешся і ты з гэтага.

## ПАМЫЛКА

• • •

Часьцей за ўсё людзі памыляюцца наконт сябе.

• • •

Нам уласьціва радзей памыляцца, чым заўважаць чужыя памылкі.

• • •

Мы часта памыляемся адносна нетрываласьці свайго становішча, але яшчэ часьцей — адносна яго трываласьці.

• • •

Той, хто імкнецца да дасканаласьці, не заўсёды прыходзіць да Бога. Часам такія прыходзяць да... непамыльнасьці.

• • •

Зрабіць высновы са сваіх памылак могуць толькі тыя, хто іх прызнае. Але не дамагайся гэтага ад людзей.

Створаная Хрыстом царква найбольш далікатна ставіцца да нас. Яна заабавязала нас прызнаваць ня ўсе свае памылкі, але толькі тыя, якія ёсьць грахом. І прапанавала рабіць гэта ў цёмным закутку сабора сам-насам усяго з адным чалаве-

кам — сьвятаром. А каб людзям было яшчэ спакайней, царква заабавязала сьвятароў таямніцай споведзі.

Вось яна, міласэрнасьць і любоў Хрыста да нас, а таксама і ступень веданьня Ствральнікам сваіх стварэньняў. А мы, часам, хочам, каб людзі прызнавалі свае памылкі перад намі...

Шмат цэркваў на зямлі ня маюць таемства споведзі і гэтым пацьвярджаюць, што іх стварылі людзі, якія... ня маюць памылак.

Дзяржавы таксама рэдка калі прызнаюць свае памылкі. Іх жа ствараюць і імі кіруюць звычайныя "беспамылковыя" людзі. Таму мусіш ад дзяржавы максымальна ўнезалежніцца. Хаця... сілу яна прызнае. Як і ўсе "беспамылковыя".

Чалавек жа павінен расплочвацца за зробленае. Паколькі яму ўласьціва не прызнаваць свае памылкі, дык і недаўменьне з прычыны няшчасьцяў і нешанцунку выглядае заканамерным і зьяўляецца часткаю належнае заплаты.

...

Ці лёгка жыць без памылак? Лёгка. Цяжка іх не рабіць.

Ці цяжка жыць з памылкамі? Цяжка. Лягчэй іх не рабіць.

. . .

Не памылісься — не пашкадуеш. Сябе.

. . .

Лепшы сродак выпраўленьня памылак — больш іх не рабіць.

. . .

Закаранеласьць у памылках — тое самае, што і закаранеласьць у грахох.

. . .

Аднаго разу памыляецца разумны, два разы — дурны, а тры разы — няварты.

. . .

Неразумна нарадзіць дзіця і асудзіць яго на свае ж памылкі. Але менавіта гэтак робіць большасьць з нас.

. . .

У адным зь лістоў біскупа Пятра Бучыса з 1933 году: ... ня толькі слабыя неаднойчы памыляюцца ў сваіх надзеях, але й магутныя ў сваіх разьліках...

. . .

Беспамылковасьць — галоўная памылка непамыльных...

. . .

Памылка выклікае павагу. Яна — вечная, бо будзе заўсёды; усеагульная, бо ўласьцівая ўсім; і на ёй — вучацца. Апрача таго, як сапраўды значная рэч, яна — і злавесная, бо бывае непапраўнаю.

## ПОМСТА

. . .

Помста — істэрычная паводле сваёй прыроды і сутнасьці.

. . .

Рэдка хто на зямлі не паддаецца асалодзе помсты, дастаўшы ўладу над крыўдзільнікам. І рызыкуе, бо няма нічога больш хісткага, чым любая ўлада...

. . .

Ты можаш прыдумляць сабе шмат карцінаў свае помсты крыўдзільніку. Лепш, аднак, зрабіць намаганьні, каб ад яго ўнезалежніцца.

. . .

У прынцыпе, нішто не замінае пристойнаму чалавеку зазнаць прыемныя па-

чуцьці пры выглядзе паразы жорсткага і самаўпэўненага нахабы.

...

Для таго, каб адплата зьдзейсьнілася, магчыма, трэба перастаць яе жадаць і быць гатовым да таго, што яна ня зьдзейсьніцца.

...

Помсьціцца можа і ня трэба, а вось сьмяяцца — так.

## РАСЧАРАВАНЬНЕ

...

Расчараваньне — доля ня толькі слабых і наіўных, але й моцных і разумных. Першыя расчароўваюцца ў чужых перакананьнях, другія — у сваіх.

...

Цынізм бывае двух тыпаў — прыродны і набыты. Другі — заўсёды вынік расчараваньня, разьвітаньня з ілюзіяй.

...

Тыя, хто расчараваўся да 40 гадоў, — мацнейшыя або шчасьлівейшыя за тых,

хто расчароўваецца пасьля 40. Калі вы расчараваліся і зразумелі ўсё да 30 гадоў — вы геній або проста асуджаны на посьпех.

...

Расчараваньня не пазьбегне ніхто. Разумныя расчаруюцца ў людзях, неразумныя — у надзеях, а ўсе разам — у жыцьці.

## СЬМЕРЦЬ

...

Калі даведваесься пра нечую сьмерць, значыць, ты яшчэ жывы.

...

Толькі пражыўшы жыцьцё, чалавек разумее, што сэнсу тузацца не было.

...

Улічваючы аднолькавы канец усіх людзей, ці мае сэнс самасьцьверджаньне?

...

Таму, хто ведае жыцьцё, лягчэй зь ім разьвітацца.

. . .

Эпітафія: не зайздрошчу жывым.

. . .

Калі чалавек памірае, адна думка не прыходзіць у галаву тым, хто плача па ім — ён БЫЎ, і з гэтым нават сьмерць нічога ня можа зрабіць.

. . .

Перад канцом скажу: я цешуся, што кахаў, жыў, быў. Але ня толькі. Я шчасьлівы, што думаў.

# FILUM VITAE
# *нітка жыцьця*

## ЛЮДЗІ

. . .

Як мала дасягнула цывілізацыя на Зямлі, калі нават яе лідэр — чалавек, нагэтулькі прымітыўны ў сваіх амбіцыях і заганах.

. . .

Мы хочам тое, што хочам. Мы дастаем тое, што можам. А ўяўляем зь сябе тое... чаго ня можам.

. . .

Людзі ня любяць няўвагі. Зважайце калі не на іх, дык на гэта.

. . .

Маеце права любіць нешта ці не

любіць. Пры гэтым іншыя маюць такое ж права ацэньваць вас паводле гэтых вашых густаў.

• • •

Чым больш людзей, якія вас любяць, тым больш людзей, якія вас ня любяць.

• • •

Ня трэба аказваць людзям паслугі, аб якіх яны ня просяць.

• • •

Толькі той, хто добра ведае людзей, можа дацаніць каштоўнасьць адзіноты.

• • •

Людзі ня хочуць ведаць праўды аб сабе. Чым хутчэй вы гэта зразумееце, тым большая колькасьць людзей будзе вас любіць, і тым большы посьпех вас чакае.

• • •

Калі нехта кажа, што ня хоча, — ня верце. Што яшчэ скажа той, хто ня можа?

• • •

Да сваіх дасягненьняў людзі часта ідуць па-рознаму. Яны аднолькавыя толькі ў сваіх заганах і хібах.

. . .

Думаць аб сабе добра — трэба. А вось гаварыць аб гэтым — не.

. . .

Большасьць людзей ня толькі жыве ў сваіх неправотах, але і хоча навязаць іх нам.

. . .

Добрых людзей значна менш, чым ахвочых імі быць.

. . .

У некаторых людзях нам больш за ўсё не падабаецца тое, што яны ёсьць.

. . .

Як мала некаторыя людзі разумеюць! І жывуць...

. . .

Толькі моцныя могуць пачынаць наноў і новае. Слабыя вяртаюцца да таго, што яны лепш ведаюць і ўмеюць.

. . .

Куміраў лепш ведаць на адлегласьці, бо надта цяжкім бывае ўражаньне пры бліжэйшым знаёмстве.

. . .

Мала хто адмаўляе сабе. Большасьць адмаўляе іншым.

. . .

Калі мы некуды хочам, мы менш за ўсё думаем, як там будзе. Найперш нас цікавіць, як туды трапіць.

. . .

Людзі розныя. Нехта можа любіць няголеных дзеля таго, што ў яго самога шчэць не расьце, а нехта з-за гэтага ж можа іх ненавідзець.

. . .

Ніхто ня любіць людзей, якія ўсё ведаюць. Няхай ведаюць і аб гэтым.

. . .

Калі маеце якую добрую думку, не сьпяшайцеся дзяліцца ёю з навакольнымі. Лепш запішыце. Напісанае застаецца. А сказанае — крадзецца.

. . .

Сутыкнуўшыся з разумова абмежаваным і нахабным маладзёнам, пачынаюць наракаць на "новае пакаленьне". Такія не разумеюць, што спрадвеку ў кож-

ным пакаленьні частка людзей нараджаецца "новым пакаленьнем".

...

Не папярэджвайце. Ніхто вас не паслухае, пакуль сам не пераканаецца... і не пачне папярэджваць іншых.

...

Людзі з вусамі звычайна ставяцца да сябе з большай павагай, чым бязвусыя...

...

Чым больш будзеце казаць людзям пра сябе, тым больш яны будуць вас не любіць.

...

Не тлумачце людзям тое, што зразумелі самі. Калі вы будзеце рабіць гэта настойліва, яны будуць толькі злавацца. Надзея, што яны зразумеюць, — ідэальная, а рэчаіснасьць — рэальная.

...

Наракаеце, што нехта побач нічога ня робіць добрага? Цешцеся, што ён ня робіць нічога кепскага. Вам.

. . .

Ня трэба недаацэньваць людзей. Кожны зь іх хоча больш, чым вы можаце.

. . .

Не дазваляйце нахабам побач з вамі палагоджваць сваё асабістае коштам вашага імя.

. . .

Саступайце, але не пераступайце пры гэтым празь сябе.

. . .

На нястачу ўвагі скардзяцца інфантылы.

. . .

Мы часта прыпісваем чалавеку безьліч адмоўных якасьцяў замест таго, каб прызнаць, што мы яго проста ня любім.

. . .

Наіўна разьлічваць, што людзі нечым паступяцца дзеля вас. Гэта могуць зрабіць толькі вашыя родныя, дый тое ня ўсе.

. . .

Шмат хто хоча быць. Мала хто — становіцца. А станавіцца цяжка яшчэ й таму,

што кожны з нас недзе падсьвядома разумее, што стаўшы — яшчэ нічога сабе не гарантуе.

. . .

Доўгая адукацыя — гэта часта толькі сублімацыя незадаволенага сэксу.

. . .

Сустрэўшы занадта, на тваю думку, годнага й самапаважнага чалавека, не сьпяшайся залічаць яго да амбітных ці нявартых. Можа ён ведае аб сабе тое, чаго ня ведаеш аб ім ты?

. . .

Кожны з нас ведае аб сабе больш, чым навакольныя аб ім. Таму і ацэньваем мы сябе інакш, чым яны нас.

. . .

Ня можаш дапамагчы, адмаўляй адразу. Гэтак застанецца больш шанцаў захаваць добрыя адносіны.

. . .

Часта кажуць, што людзі розныя. Здаецца, існуе столькі ж падставаў сьцьвярджаць, што яны — аднолькавыя.

. . .

Са шчырымі трэба быць асьцярожным. Яны пасьля спахопяцца і пачнуць помсьціцца на тым, хто міжволі стаў сьведкам іхнае слабасьці.

. . .

Калі цябе хваляць ці ганяць, ня трэба заўсёды ўспрымаць гэта як пахвальбу ці лаянку. Магчыма, некага проста цікавіць твая рэакцыя.

. . .

Чым даўжэй жывеш, тым менш хочацца называць людзей людзьмі. Хочацца называць іх людцамі альбо людзечкамі, а можа, нават, і людчыкамі.

. . .

Сабе трэба даравацць радзей, чым людзям.

. . .

Свайго, як і чужога, можна пазнаць адразу. Шкада, што мы часам забываем пра гэта і прымушаем сябе зьмяніць думку аб чалавеку, аб якім яна ў нас ужо складзеная.

...

Народная мудрасьць пра тое, што вочы — люстра душы, слушная. Часьцей зазірай людзям у вочы. Яны шмат скажуць пра чалавека. Другое люстра душы — усьмешка. Азірніся вакол, і ўбачыш, што вельмі многія людзі побач усьміхаюцца нядобра.

...

Зьвяртаючыся па дапамогу да людзей, не забудзься, што многія ня маюць чым дапамагчы, а большасьць — і ня мае жаданьня.

...

Чужое любяць за тое, што добрае. А сваё — за тое, што сваё.

...

Калі табе нехта сапсаваў настрой, дык самы хуткі шлях яго палепшыць — гэта добра разважыць, ці варты настрою той, хто яго псуе.

...

Той, хто забывае пра няўстойлівасьць і дачаснасьць усяго, у тым ліку і свайго становішча, заўсёды плаціць за гэта. І добра, калі толькі стратай становішча...

. . .

Інтарэс некаторых людзей да нас тлумачыцца іх карысьлівым жаданьнем "пакласьці нас сабе ў кішэню". У адказ няма іншага выйсьця, як пацікавіцца і імі з той жа мэтай.

. . .

Бяз нашых фантазіяў нам заставалася б толькі сумная рэчаіснасьць. Але ставімся мы да іх па-рознаму. Адны з нас хаваюцца ў летуценьнях ад рэчаіснасьці, а іншыя ўсяляк намагаюцца скараціць адлегласьць паміж марамі і рэальнасьцю.

. . .

Шмат хто ведае, як ня трэба. Значна менш тых, хто ведае, як трэба. І яшчэ менш тых, хто так робіць.

. . .

Людзі, якія заўсёды прапускаюць некага наперад, могуць выклікаць усе пачуцьці, апрача аднаго, — павагі таго, каго прапускаюць.

. . .

Мала хто з нас, хочучы, думае яшчэ і пра тое — а ці можа?

. . .

Як часта, спазнаўшы шмат людзей, мы, урэшце, кажам сабе, што лепш бы мы іх і ня ведалі...

. . .

Як ні дзіўна, але зь людзьмі, да якіх нас вабіць, мы лягчэй разьвітваемся, чым сустракаемся...

. . .

Іншым разам мы дазваляем падкупіць нас за наш жа кошт.

. . .

Мы часта думаем, што нас не разумеюць, але аказваецца, што не разумеем мы.

. . .

Калі людзі хочуць, каб пра іх гаварылі, — гаварыце. Але думайце пры гэтым пра сябе.

. . .

Авантурысты прыцягваюць нашую ўвагу, бо могуць наважыцца на тое, на што мы ня здатныя.

. . .

Сьмяяцца зь людзей трэба. Лепш за ўсё ў душы.

• • •

Чалавек чалавеку... супернік. І гэта яшчэ ня горшы варыянт.

• • •

Перш чым вырашаць праблемы, навучыся спачатку іх не ствараць.

• • •

Чалавеку, які цэлае жыцьцё нешта ўдае, можа не застацца, чаго ўдаваць.

• • •

Людзі, якія перакананыя, што могуць зрабіць значна лепш, пераважна гэтага ня робяць.

• • •

Як часта, баронячы іншых, мы баронім найперш сябе!

• • •

Як рэдка мы робім паслугу, нічога не чакаючы ўзамен!

• • •

Недвухсэнсоўныя ўчынкі не заўсёды сьведчаць пра празрыстасьць намераў.

. . .

Ня ўсе людзі ўмеюць. Горш, што некаторыя ня хочуць.

. . .

Шмат хто з нас ня меў бы праблемаў, калі б памятаў запавет продкаў не пляваць у калодзеж, зь якога п'е.

. . .

Колькі б усяго чалавек ня меў, заўсёды будзе тое, чаго ён ня мае і хоча.

. . .

Людзей збліжаюць ня іх вартасьці, але іх недахопы. А людзі з заганамі інтуітыўна адчуваюць і знаходзяць адно аднаго.

. . .

Чым менш ведае чалавек, тым больш ён катэгарычны, і тым больш ён цырымонны.

. . .

Увага наўпрост залежыць ад жаданьня. Чым больш жаданьня, тым менш увагі.

. . .

Менш праблемаў мае той, хто іх менш

ствapae. Затое той, хто стварае іх больш, не абавязкова і больш іх мае. Бо частку іх ён стварае навакольным.

. . .

Нельга забараніць чалавеку чыніць сабе шкоду. Ніхто так ня шкодзіць чалавеку, як ён сам.

. . .

Той, хто ня можа даць рады сабе, ня дасьць яе і іншым.

. . .

Бывае, мы прызнаемся іншым людзям у тым, у чым доўгі час не наважваліся прызнацца сабе.

. . .

Мы шчыра спадзяемся на дапамогу, забываючы, што рэдка хто не спрабуе выкарыстаць нас у сваіх інтарэсах.

. . .

Людзям вакол вас не цікава, кім вы сябе ўважаеце. Ім важна, кім вы ёсьць.

. . .

Чым менш зь сябе чалавек уяўляе, тым большым ён хоча сябе ўяўляць. На жаль.

. . .

Чалавек створаны, каб аб кімсьці клапаціцца. Ёсьць дзеці — дбае пра іх, няма — дбае пра сябе.

. . .

Сваю агульнасьць людзі часта выяўляюць у драбязе.

. . .

Мы амаль ня можам уплываць на сымпатыі-антыпатыі да сваёй пэрсоны. Гэтак ёсьць таму, што яны ў большай ступені — асабістая справа таго, каму мы падабаемся ці не падабаемся, чым нашая.

. . .

Некаторым памочнікам хочацца сказаць: ведаеш, ёсьць людзі, якія сапраўды хочуць дапамагчы...

. . .

Адна з самых распаўсюджаных памылак — нашае няўменьне схаваць ад людзей тое, што мы іх разумеем.

. . .

Бывае, каб зьвярнуць на сябе ўвагу нейкага чалавека, трэба перастаць зьвяртаць на яго ўвагу.

. . .

Як ні дзіўна, прымітыўныя рэчы займаюць ня толькі прымітыўных людзей.

. . .

Большасьць людзей — троху дзеці. Ад гэтага вельмі цяжка тым, хто зусім дарослы.

. . .

Нашае зьдзіўленьне часта ня мае межаў, бо ня мае межаў нахабства таго, хто нас дзівіць.

. . .

Празьмерная дабрыня не прыносіць жаданых вынікаў празьмерна добрым.

. . .

Людзі стаюцца ахвярамі ня толькі свайго невуцтва, але й сваёй адукаванасьці.

. . .

Выслухоўваць людзей да канца — у нашых інтарэсах.

. . .

Людзі розныя нагэтулькі, што ім ніколі так і ня стаць аднолькавымі. І

здольнасьцям нашым ня суджана зраўнацца, і кожнае пакаленьне непазьбежна народзіць сваіх талентаў і сваіх дурняў.

. . .

Памыляецца ня толькі той, хто ня дзякуе за параду, але й той, хто дае такому параду другі раз.

. . .

Людзі, якія ня маюць уласнага жыцьця, пачынаюць цікавіцца чужым.

. . .

Мы думаем, часам, што людзям цікавая наша асоба, а яны цікавяцца тым, што мы маем або можам ім даць.

. . .

Чым менш будзем ад людзей чакаць, тым больш атрымаем.

. . .

Найбольш нахабная істота — чалавек. Нягледзячы на ўсё ім зробленае, ён усё адно чакае лепшага.

. . .

Большасьць людзей задавальняецца тым, што побач. Людзі не заўважаюць,

як зь цягам часу іх жаданьні, мары і памкненьні перастаюць выходзіць за межы таго, што можна акрэсьліць словам "навакольнае".

. . .

Адзін дае, а другі паказвае, што дае.

. . .

Дасягненьне матэрыяльных выгодаў робіць чалавека дробязным і няўступлівым, што да мізэрных адзнакаў ягонага посьпеху.

. . .

Фальшывыя ня толькі не заўважаюць свайго фальшу, але й думаюць, што яго не заўважаюць іншыя.

. . .

Дробныя людзі звычайна не ўздымаюцца вышэй за дробную помсту.

. . .

Актуальнасьць думак антычных і сярэднявечных мысьляроў і маралістаў новага часу дазваляе меркаваць, што людзі зь іх цнотамі й заганамі ня зьменяцца ніколі. Мяняюцца хіба што суадносіны паміж гэтымі апошнімі.

. . .

Кожны з нас ёсьць закладнікам каго-небудзь ці чаго-небудзь, але большасьць — сябе.

. . .

Памыляецца той, хто на падставе адносінаў да яго іншага чалавека робіць высновы аб тым чалавеку.

. . .

Ня ўсе тыя, хто мае права, маюць яшчэ й маральнае права.

. . .

Увага некаторых людзей да нас часта тлумачыцца ня іхным інтарэсам да нашай асобы, але іхным інтарэсам да сваёй асобы.

. . .

Людзі, якія аднойчы вырашылі, што дзеля дасягненьня сваіх мэтаў ня будуць лічыцца зь іншымі людзьмі, у пэўны момант ня будуць лічыцца і зь іх жыцьцямі.

. . .

Людзі — канібалы. Яны не ядуць сабе падобных, яны іх "зьядаюць".

. . .

Адны з нас дапамагаюць, каб дапамагчы, іншыя — каб самасьцьвердзіцца.

. . .

Людзям уласьціва сваю нерашучасьць выдаваць пасьля за сумленнасьць і прыстойнасьць.

. . .

Купіць можна ня толькі ўсё, але і ўсіх. Зьбірайце грошы.

. . .

Ня ўсе разумеюцць, што аб людзях трэба меркаваць ня толькі па іх учынках, але й паводле іх дасягненьняў.

. . .

Мы думаем, што людзям дастаткова нашых пачуцьцяў да іх, а яны чакаюць ад нас словаў, якімі гэтыя пачуцьці выказваюцца...

. . .

Ня толькі мы чакаем ад людзей больш, чым яны могуць нам даць. Таго ж самага людзі чакаюць і ад нас.

. . .

Людзі ня хочуць станавіцца разумнымі з той самай прычыны, зь якой яны ня хочуць здавацца дурнямі.

. . .

Розум варты таго, каб яго губляць. Ня вартаю звычайна бывае падстава, дзеля якой яго губляюць.

. . .

Колькасьць назапашаных ведаў не абавязкова робіць чалавека разумным. Дурань-эрудыт — ня рэдкасьць.

. . .

Ці сумяшчальныя розум і весялосьць? Рэдка. Значна лепш сумяшчаюцца розум і сьмех.

. . .

Шкада, што жыцьцёвы розум вельмі часта — плён заганы.

. . .

Прыкра, вядома, залежаць ад дурня. Але ў нашым сьвеце калі нешта ад нечага і залежыць, дык гэта разумнае ад дурнога.

. . .

Аднабокасьць зацікаўленьняў — верная прыкмета абмежаванага розуму.

. . .

Толькі разумны можа зразумець, што людзі ня думаюць так, як ён.

. . .

Каб пераняць ад іншага чалавека нешта разумнае, трэба самому ня быць дурнем.

. . .

Можна, вядома, развaжаць, што ўсе людзі розныя, што ўсе маюць права... А можна сказаць і так: людзі падзяляюцца на ўпартых і... разумных.

. . .

Важна быць разумным, але яшчэ важней разумна паводзіцца.

. . .

Ня можа лічыцца разумным той, хто не зразумеў, што людзі маюць права быць дурнямі.

## ДУРНОТА

. . .

Ня ўсім людзям патрэбны розум. Большасьць зь іх цалкам задавальняецца сваёй дурнотай.

. . .

Дурнота зьяўляецца ня толькі адной з падставаў людзкое разнастайнасьці, але й падставай замацаваньня гэтай разнастайнасьці ў законах і канстытуцыях.

. . .

Дурняў ня больш, чым людзей.

. . .

Дурні бываюць двух тыпаў — упартыя і не. Як ні дзіўна, зайздросьціць трэба першым: яны ніколі так і не даведаюцца, што яны — дурні.

. . .

Розьніца паміж рэфлексіяй дурнога і разумнага палягае на тым, што ў першым выпадку ў ёй абавязкова прысутнічае беспадстаўнае.

. . .

Разумны назаве сябе дурнем дзесяць разоў, дурань — ні разу.

. . .

Менавіта зробленая другі раз адна і тая ж памылка паказвае, што ты — дурань.

. . .

Дурні патрэбныя для таго, каб іншая частка чалавецтва адчувала сябе разумнай.

. . .

Ёсьць адна рэч на зямлі, зь якой пагадзіцца вельмі цяжка, — гэта шанцунак дурняў.

. . .

Паколькі дурнота на зямлі невыкараняльная і ўвесь час самааднаўляецца, трэба зрабіць выснову, што яна, як і розум, — таямніца нябёсаў. Другі доказ прыхільнасьці нябёсаў да дурняў — іх нязьменны шанцунак.

. . .

У падмурку суцэльнага адмаўленьня могуць ляжаць трагедыя, боль, зьняверанасьць, але часьцей — дурнота.

. . .

Некаторыя з нас імкнуцца да разумных кампаніяў. Такія не разумеюць, што іншым разам лепш стаяць побач з самаўпэўненым дурнем і адчуваць сябе знаўцам жыцьця.

. . .

Кажуць, неразумна даводзіць дурню, што ён дурань. Здаецца, дурню ўвогуле неразумна што-кольвечы даводзіць...

. . .

Ёсьць дурныя пытаньні і пытаньні дурняў. Калі часта ставіць першыя, можна ператварыцца ў аўтара другіх.

. . .

У момант, калі дурнота захоча стацца разумнаю, яна перастане быць дурнотай.

. . .

Тупасьць таму і тупая, што ня хоча завастрыцца.

. . .

Дурняў не гадуюць. Ім дазваляюць такімі быць.

. . .

Толькі дурні жывуць і ня ведаюць, чаму яны жывуць кепска.

. . .

Дурня цяжэй зьдзівіць.

. . .

За любоўна датрыманымі звычкамі дурань хавае ўнутраную пустэчу.

. . .

Бясспрэчна, што дурні — таксама людзі. Але бясспрэчна і тое, што празь іх разумныя маюць значна больш праблемаў, чым маглі б мець.

. . .

Дурні пачынаюць думаць пра будучыню тады, калі яна наступае.

. . .

Менавіта ідыёты часьцяком пытаюцца: "Што я — ідыёт?"

. . .

Дурню звычайна, апрача розуму, не хапае сьціпласьці.

. . .

Толькі дурні чакаюць, пакуль навакольныя прызнаюць іхныя заслугі. Разумныя прымушаюць свае заслугі прызнаць.

. . .

Вучаць усіх — мала хто вучыцца, і яшчэ менш — навучваецца.

. . .

Часам трэба сказаць сабе: калі я не разумны, дык хто тады разумны?

. . .

Нават разумныя людзі шмат што разумеюць позна.

. . .

Як на разумнага чалавека, дык добрых месцаў ня так і мала.

. . .

Вернасьць ідэалам — часта прыкмета слабога розуму.

. . .

Нягнуткасьць розуму — сьведчаньне яго адсутнасьці.

. . .

Дурнота — саюзьніца зла.

## ГОНАР І ГОДНАСЬЦЬ

. . .

Людзям уласьціва ганарыцца тым, да чаго яны ня маюць дачыненьня.

. . .

Калі ганарыцца няма чым, ганарацца проста сабой.

. . .

Наўрад ці мае годнасьць той, хто топча яе ў іншых.

. . .

Ганарлівыя, калі справа датычыцца іхнага гонару, часта забываюць пра яго.

. . .

Нашая годнасьць урэшце аказваецца патрэбнаю толькі нам.

. . .

Быў бы гонар, а чым ганарыцца — знойдзецца.

## ВЕТЛІВАСЬЦЬ

• • •

Ветлівасьць нічога не каштуе, але прыносіць неблагія дывідэнды.

## ГАСЬЦІННАСЬЦЬ

• • •

У некаторых гасьцях мы чуемся вельмі ў гасьцях.

• • •

Некаторыя гаспадары любяць пускаць гасьцям пыл у вочы ў выглядзе адсутнасьці пылу.

• • •

Дзе палягае мяжа паміж гасьціннасьцю, з аднаго боку, і нахабнасьцю таго, хто вырашае свае праблемы за кошт чужое гасьціннасьці, з другога? Яна палягае паміж вашай сумленнасьцю і чужой бессаромнасьцю. А можа і проста супадае з нашай нерашучасьцю.

## СЬМЕЛАСЬЦЬ

. . .

Толькі пажыўшы, разумееш, што тое, што нам здаецца моцным, насамрэч — слабое. Сапраўды моцнае — сьмелае.

. . .

Дзьве рэчы блытаюць заўсёды — сьмеласьць і дурноту.

## ЭГАІЗМ

. . .

Эгаізм — можа і ненармальная рэч, але гэта — норма нашага жыцьця.

. . .

Самай важнай кожны лічыць тую падзею, у якой браў удзел сам.

. . .

Некаторыя робяцца вельмі мэтанакіраванымі, калі мэта — яны самі.

. . .

Безнадзейна заняты сабой чалавек звычайна не заўважае, што ўсе вакол ужо заўважылі гэтую ягоную якасьць.

. . .

Вартыя жалю людзі, якія губляюць інтарэс да кампаніі, калі іх перастаюць слухаць.

. . .

На тое, што людзі эгаісты і дбаюць толькі пра сябе, наракаюць звычайна тыя, хто спадзяваўся, што людзі падбаюць і пра іх.

. . .

Эгаіст хваліць толькі тых, чый аўтарытэт уздымаючы, уздымаецца сам, або тых, хто, як ён спадзяецца, пахваліць і яго.

. . .

Людзі з паблажлівай усьмешкай любяць і паважаюць толькі сябе.

. . .

Мы часта пытаемся, адкуль некаторыя людзі ведаюць, як паводзіцца ў пэўнай сытуацыі, — што казаць, чаго не казаць. За гэта мы нават прыпісваем ім надзвычайныя інтэлектуальныя здольнасьці. А насамрэч аказваецца, што яны ў сваіх паводзінах кіруюцца ня розумам, але прыроднай падступнасьцю, злахітрасьцю ды

іншымі чалавечымі заганамі. Уласны інтарэс — вось іх падручнік!

. . .

Сустрэўшы зваду, можна й ня слухаць аргумэнтаў зваднікаў. Што б яны ні казалі, прычыны заўсёды будуць асабістыя.

. . .

Уласны інтарэс замінае нам часта бачыць нават бліжэйшую пэрспэктыву.

. . .

Гэх, каб няправоты нашых бліжніх мы даравалі ім гэтаксама лёгка, як свае сабе!

. . .

Нават дробныя людзі здольныя выяўляць вялікую волю, калі справа датычыцца іх саміх.

. . .

Захапіўшыся, бывае, нейкім маладым чалавекам, мы не заўважаем, як праз некалькі гадоў зь яго вырастае пачварка, што пільнуе толькі свой інтарэс.

. . .

Два эгаізмы цяжка суіснуюць у шлюбе, затое квітнеюць у палюбоўніцтве.

. . .

Як шчымліва і чуйна ставяцца самалюбцы да свайго здароўя! Як любяць яны паразважаць аб ім і паскардзіцца на хваробы, сьвяткуючы ў душы маленькую перамогу ад усьведамленьня, што насамрэч скардзіцца няма на што. Такія доўга жывуць. Але таксама паміраюць.

. . .

Эгаізм аднаго бывае прычынаю бедаў многіх.

. . .

Інтарэс перамагае ідэю. Асабісты. На жаль.

. . .

Як лёгка мы адмаўляем іншым у праве мець тое, што маем самі.

. . .

Самалюбца недальнабачна пагарджае чалавекам, які пасьля і вырашыць ягоны лёс.

. . .

Які маральны прагрэс мог бы чакаць чалавецтва, калі б людзі троху зьменшылі сваю карысьлівасьць!

## САМААЦЭНКА

. . .

Падчас ацэнкі іншых мы заўсёды памыляемся наконт сябе.

. . .

Мы выстаўляем сабе завысокую цану і пасьля дзівімся, чаму ніхто не купляе...

. . .

Калі чыясьці самапавага ня мае межаў, дык мае межы павага да яго з боку іншых.

. . .

А ля Лец: цешыўся бязьмежнай самапавагай.

. . .

Мала пра сябе добра думаць. Трэба, каб і іншыя падзялялі гэтую вашую думку.

. . .

Кожны з нас ведае аб сабе больш, чым навакольныя аб ім. Таму і ацэньваем мы сябе інакш, чым яны нас.

. . .

Адэкватнасьць — нячастая госьця ў самаацэнках.

. . .

Павярхоўны чалавек — павярхоўны і ў ацэнцы самога сябе.

. . .

Усе людзі добрыя, калі пра сябе расказваюць.

. . .

Заніжаная самаацэнка не выключае завышанае. У адной асобе.

. . .

Неадэкватная самаацэнка ўласьцівая і тым, хто гэта разумее.

## АМБІЦЫЯ

. . .

У адной сваёй якасьці нікчэмнасьць зьяўляецца вялікаю. У сваёй амбіцыі.

. . .

Часам здаецца, што кожная амбіцыя — беспадстаўная.

. . .

Людзі трымаюцца неправотаў не таму, што не разумеюць гэтага. Была б амбіцыя, а неправоты знойдуцца...

. . .

З усіх чалавечых імкненьняў і парываў найменшае павагі заслугоўвае пыха.

. . .

У людзей з напалеонаўскімі плянамі звычайна і маштаб самапавагі — напалеонаўскі.

. . .

Ці ёсьць нешта саладзейшае за цукар? Ёсьць. Задаволеная амбіцыя. А што саладзейшае за яе? Беспадстаўна задаволеная амбіцыя.

. . .

Пасыўнасьць можа быць ня толькі вынікам сьціпласьці, але й перакананае ў сваёй вартасьці амбіцыі.

. . .

Мы можам даравацъ нават здраду, ману і паклёп за адну толькі ўвагу да нашае пэрсоны. Рэдка які здаровы сэнс можа перамагчы ўлешчаную амбіцыю.

. . .

Недахоп глуздоў амаль заўсёды кампэнсуецца амбіцыяй.

. . .

Амбітны ня можа быць добрым.

## ЖАНЧЫНА

. . .

Жанчына дае, каб узяць. Мужчына бярэ, каб аддаць.

. . .

Ператвараць сваю слабасьць у сваю сілу ня можа ніхто, апрача жанчын.

. . .

Побач з эфэктнымі жанчынамі ўрэшце апынаюцца не эфэктныя, але эфэктыўныя мужчыны.

. . .

Жанчыны больш фальшывыя за мужчынаў. Гэтак яны прыкрываюць сваю слабасьць і бароняць сваю чульлівасьць.

. . .

У выпадку жанчыны фальш — цалкам легітымная зброя ў барацьбе за выжываньне. У выпадку мужчыны фальш — прыкмета бабскай сутнасьці ягонага характару.

. . .

Жанчыны ўплываюць на мужчын больш, чым самі мужчыны думаюць,

але й часта менш, чым думаюць жанчыны.

. . .

Некаторыя жанчыны занадта відавочна выкарыстоўваюць мужчын. Трэба было б больш завуалявана, ды няма каму параіць: яны не кантактуюць з тымі, каго не выкарыстоўваюць.

. . .

Жанчыны могуць выкарыстоўваць далёка ня ўсіх мужчын. Зрэшты, ад тых, каго яны ня могуць выкарыстаць, нічога й не залежыць.

. . .

Жанчына, якая рухаецца па жыцьці, выкарыстоўваючы мужчын, бывае ўрэшце сама выкарыстаная адным зь іх.

. . .

Няма нічога больш неразумнага, як вінаваціць жанчыну ў тым, што яна вас выкарыстоўвае...

. . .

Наіўны той, хто не разумее, што ў спрэчцы жанчыну менш за ўсё цікавіць сутнасьць справы.

. . .

Для некаторых жанчын старасьць — гэта "крызыс жанру".

. . .

Самы распаўсюджаны бізнэс жаночай паловы чалавецтва — замужжа.

. . .

Пару разоў у жыцьці, шпацыруючы недзе ці робячы яшчэ нешта, вы можаце сустрэць нагэтулькі прыгожую і дасканалую жанчыну, што, адкрыўшы рот і зьнямеўшы, уражана пойдзеце за ёй у літаральным і ў пераносным сэнсах. Я б параіў спыніцца. "Нагэтулькі прыгожыя" заўсёды цікавяцца ня вамі. Яны заўсёды бяруць вышэй. А калі яна ўсё ж зьверне на вас увагу, тым горш для вас. Вас скарыстаюць.

. . .

Ступень эгаізму жанчыны наўпрост залежыць ад яе прыгажосьці. Тут усё проста. Найбольш прыгожыя — найбольшыя эгаісткі.

. . .

Бар'ерам на шляху пранікненьня інтэлекту ў галаву жанчыны зьяўляюцца

ейны твар і пастава. А дакладней — ступень дасканаласьці рысаў гэтага твару і гэтай паставы. Нейкім надпрыродным чынам ужо маленькія дзяўчынкі, дзясятым пачуцьцём зразумеўшы, што іх твар і пастава — будуць прываблівацць, цалкам губляюць інтарэс да кніжак і ўсялякіх там разумных рэчаў... Здаецца, гэта і ёсьць таемства полу і яго наканаваньне.

• • •

Самыя прыгожыя жанчыны — звычайна самыя няшчасныя. Маючы высокія патрабаваньні да жыцьця і, натуральна, да мужчын, яны ўрэшце патрапляюць закахацца ў таго, для каго яны — ня рэдкасьць...

• • •

Інфантыльныя жанчыны выбіраюць сабе маладзейшых мужоў.

• • •

Як сказаў адзін разумнік — жанчыны фатальна няўстойлівыя.

• • •

Жанчыны памыляюцца, ігнаруючы заклікі мужчын.

• • •

У поўнай адпаведнасьці з Эвангельлем

можна падказаць мужу: наракаць на сваю жонку ён будзе датуль, дакуль яна будзе выяўляць самастойнасьць і ня раіцца зь ім.

• • •

З жанчынамі ўсё проста. Яны падзяляюцца на прыгожых і не. Прыгожыя для дасягненьня сваіх мэтаў карыстаюцца прыгажосьцю. А непрыгожыя ўвесь час намагаюцца стаць прыгожымі і... скарыстацца са свае прыгажосьці.

• • •

Непрыемнае відовішча — жанчына з упэўненасьцю і хваткай мужыка.

• • •

Рацыянальныя кабеты выклікаюць супярэчлівыя пачуцьці.

• • •

Здымаю капялюш перад тым, хто першы параіў выслухаць кабету і зрабіць пасвойму.

• • •

Актыўныя кабеты схільныя блытаць сэксуальны інтарэс да іх з інтарэсам да іх асобы.

. . .

Не жанчыны вінаватыя, што кар'ера многіх зь іх пралягае праз ложак.

. . .

Найбольш актыўна да жанчын заляцаюцца няўдачлівыя...

. . .

Калі мараліст скептычна піша пра жанчын, гэта не азначае, што ён ня мае для іх ласкавых словаў.

## ЛЯНОТА

. . .

Бязьдзеяньне ня мае апраўданьняў.

. . .

На колькі працавітасьць дапамагае бяздарнасьцям, на столькі ж ейны антыпод — лянота — шкодзіць талентам. Містычная раўнавага ў сьвеце рэфлексіі.

. . .

Гэта нядобра — ленавацца хадзіць на могілкі да сваякоў...

. . .

Змагацца зь лянотай ухвальна, але

бессэнсоўна. Пакуль вы зь ёю змагаецеся — нехта працуе.

...

На ляноту наракаюць лянівыя, бо гэта — не праблема працавітых.

...

Калі вы і хочаце, і лянуецеся — не спадзявайцеся.

...

Той, хто лянуецца ўстаць, палянуецца і зрабіць.

...

Добра было б ленавацца рабіць толькі нявартую справу.

...

Многія з нас аддалі б шмат сваіх якасьцяў за адну толькі працавітасьць... але лянуюцца.

...

Сярод людзей вельмі мала актыўных на карысьць іншых. Затое вельмі шмат пасыўных на шкоду сабе.

. . .

Лянота — заразная, але інфікуецца ёй выключна адзін тып людзей — дурні.

. . .

Пільнуйся лянівых і амбітных. Яны маюць звычку нахабна зацягваць справу.

. . .

Сярод нас нямала тых, хто ўвогуле ня ведае, што гэта такое — прымусіць сябе.

. . .

Лянівы не разумее, што да нязробленае сёньня справы заўтра дадасца заўтрашняя.

. . .

Лянівыя людзі ў сваіх размовах часьцей ужываюць будучы час.

. . .

Спраўны зробіць, гультай заплянуе.

. . .

Лянівы чалавек ня толькі нічога ня робіць — ён яшчэ й ня любіць, калі яму аб гэтым нагадваюць.

. . .

Мы — няўдзячныя. Мы ня любім ляноту якраз за тое, што яна любіць нас.

## ПРЭТЭНЗІЯ

• • •

Прэтэнзія не ўпрыгожвае. Але дапамагае.

• • •

Прэтэнзія бывае ня толькі прычынаю посьпеху, але й яго вынікам. У другім выпадку яе добра відаць на твары.

• • •

Адукаванасьць бывае формай прэтэнзіі небагатых людзей.

• • •

Арыстакратаў мала. Прэтэндэнтаў больш.

• • •

Некаторыя з нас не разумеюць, што ўпэўненыя не ў сабе, а ў сваёй прэтэнзіі. Як сьмешна глядзець на такога, з высока ўзьнятай галавой...

• • •

Людзі, якія кажуць, што ня маюць аўтарытэтаў, — памыляюцца. Яны самі для сябе — найвялікшы аўтарытэт.

. . .

Прэтэнзія часта не разумее, што робіць сябе недаступнаю менавіта для таго, каго (ці чаго) яна хоча.

. . .

Людзям з прэтэнзіяй трэба не забывацца, што яна хоць і важная, але не галоўная. Галоўная ўсё ж — праца.

. . .

У прэтэнзіі — свае праблемы. Бо зашмат хоча ня толькі ад навакольных, але і ад сябе.

. . .

Па сутнасьці, саромеецца той, хто мае прэтэнзію. Бо хто яе ня мае, таму й не залежыць на чужой апініі.

. . .

Прэтэнзія стварае сваім адэптам праблемы, самая вялікая зь якіх — патрэба адпавядаць ёй.

. . .

Прэтэнзія прэтэнзію знаходзіць.

. . .

Дзьве прэтэнзіі сябруюць зьнешне, а ўнутрана — пераўзыходзяць адна адну.

. . .

Некаторыя сваю прэтэнзію неасьцярожна перадаюць і сваім дзецям. Гэта кепска нават тады, калі дзеці маюць для яе падставы.

. . .

Не апошнія людзі ў правінцыі — першыя ахвяры прэтэнзіі.

. . .

Прычына прэтэнзіі — дурнота.

## ЗАЙЗДРАСЬЦЬ

. . .

Агледзьцеся вакол, і вы заўсёды ўбачыце вочы, якія глядзяць не на вас, а на тое, што вы маеце.

. . .

Зайздрасьць — зьява нярэдкая. Шмат што можа быць прадметам зайздрасьці, і шмат для каго. Але лепшыя з нас, зайздросьцячы, хочуць мець такую ж рэч, горшыя — тую ж.

. . .

У прынцыпе, зайздрасьць — station-

чая якасьць. Яна — усяго толькі адна з матывацыяў нашых паводзінаў і ўчынкаў; жаданьне мець тое, што мае іншы. А тое, што яна часта прыводзіць да адмоўных вынікаў, не яе, а наша бяда. Каханьне, напрыклад, — бясспрэчна добрая рэч — часам таксама прыводзіць чалавека да благіх вынікаў. Справа ў нашай маральнасьці.

* * *

Удалым людзям лёс часта пасылае зайздрасьць, з-за чаго яны ня могуць дацаніць сваю ўдаласьць.

* * *

Часам тое, што прыходзіць да нас зь лёгкасьцю, натуральна і без асаблівых намаганьняў, зьяўляецца прадметам шматгадовае пажадлівае жарсьці нейкага нашага знаёмца. Таму наіўна зьдзіўляцца, што нашае права валодаць нечым ня ўсе прызнаюць, а некаторыя яшчэ й спрабуюць яго адабраць...

* * *

Слухай тон і інтанацыю сваіх зайздросьнікаў. Гэта шмат скажа аб тваёй будучыні.

. . .

Нават той, хто ўважае сябе самым няшчасным небаракам, мусіў бы ведаць, што побач нехта заўсёды знойдзе падставу яму пазайздросьціць.

. . .

Калі вы думаеце, што ніколі нічога нікому не зрабілі кепскага — вы памыляецеся. Побач заўсёды ёсьць той, каму вы шкодзіце. Няважна, чым. Ці то сваёй працай, ці то колерам чаравікаў, ці то аблічча жонкі. Нечым.

. . .

Вельмі часта прычынаю нашых праблем ёсьць адсутнасьць пачуцьця небясьпекі ў размовах. Памятайце пра ўсё нядобразычлівае і зайздроснае вакол.

. . .

Калі важны для вас чалавек нечакана зьмяніў свае адносіны да вашай пэрсоны, пашукайце сярод ягонага атачэньня некага не зацікаўленага ў вас.

. . .

Некаторыя сярод нас маюць ад нараджэньня дабрыню і набытую зайздрасьць. Яны кідаюцца дапамагаць нека-

му, а дапамогшы — тут жа пачынаюць яму зайздросьціць.

...

Зайздросныя звычайна шмат маюць. Хто ня мае нічога — не зайздросьціць. Яму няма з чым параўноўваць.

...

Простыя людзі бываюць прымітыўнымі ў сваіх поглядах, густах, звычаях. Затое так званыя інтэлектуалы — вельмі часта прымітыўныя ў сваёй зайздрасьці і пысе.

...

Да чужых жанчын чапляюцца зайздросныя мужчыны.

...

Зайздрасьць сэксу сябра — распаўсюджаны тып зайздрасьці сярод мужчынскае часткі грамадзтва.

...

І непрыязнасьць, і варажнеча, і нагул, увесь спэктар адмоўных людзкіх пачуцьцяў — часьцей за ўсё праявы толькі аднаго зь іх — зайздрасьці.

...

Асабліва зайздросныя здольныя асабліва доўга памятаць крыўду.

...

Перш чым дзяліцца радасьцю, падумайце аб зайздрасьці.

## УДЗЯЧНАСЬЦЬ І НЯЎДЗЯЧНАСЬЦЬ

...

Рэальная падзяка рэдка дасягае памераў чаканае.

...

Людзі да такой ступені няўдзячныя, што часта пачынаюць хваліцца сваімі дасягненьнямі нават перад тымі, каму яны імі й абавязаныя.

...

Няўдзячнасьць тым больш прыкрая, чым больш вы зрабілі для няўдзячнага. І тым больш верагодная.

...

Кажучы "дзякуй", мы не заўсёды дзякуем...

. . .

Удзячнасьць — пераменлівая і загадкавая. Вартаму яе — ня дзячаць, і вельмі часта дзячаць таму, хто падзякі не заслужыў.

. . .

Няўдзячнасьць бывае сьвядомая і несьвядомая. Брыдка, калі сьвядомую няўдзячнасьць маскіруюць пад несьвядомую. Такіх выдаюць вочы.

. . .

Няўдзячнасьць — заўсёды неадплата, як і неадплата, вельмі часта, — няўдзячнасьць.

. . .

На недахоп падзякі скардзяцца тыя, хто не разумее, што ўдзячнасьці сярод людзей значна меней, чым яе патрэбна.

. . .

Ад дэфіцыту крыві паміраюць, а ад дэфіцыту падзякі — не.

. . .

Дзякуючы за нешта людзям, не рабі выгляд, што ты ім абавязаны. Яны могуць неадэкватна ацаніць сваю паслугу.

. . .

Няўдзячнасьць уласьцівая вельмі дурным і вельмі разумным.

. . .

Няўдзячныя не разумеюць, што доўга выкарыстоўваць людзей без падзякі нельга. Сярод неаддзячаных можа знайсьціся той, хто адпомсьціць за незаплату.

. . .

Прыстойны адкажа на няўдзячнасьць з пачуцьцём меры. Той жа, хто мае яшчэ і веру, падзякі не чакае.

. . .

Шмат хто моцна зьдзівіўся б, калі б зразумеў, што ў няўдзячнасьці да сябе вінаваты сам.

. . .

Бывае, чалавеку важна зразумець, што ягоная парада будзе выкарыстаная без падзякі, і не даваць яе.

## НЕДАСКАНАЛАСЬЦЬ

. . .

Горка бывае пераканацца ў недаска-

наласьці і прымітыўнасьці людзей на прыкладзе ўласных бліжніх... Але яшчэ горай бывае пераканацца ў гэтым на прыкладзе самога сябе.

...

Ведаючы, што мы кепскія, мы ўсё роўна крыўдзімся, калі аб гэтым кажуць іншыя.

...

Якую думку мы часьцей за ўсё гонім ад сябе? Тую, якая нагадвае, што мы горшыя, чым сябе пераконваем.

...

Чым больш маем — тым больш здаецца, што маем менш.

...

Ці ёсьць тое, што нельга зьлічыць? Ёсьць. Нашыя хібы й заганы.

...

Формула працы: рэдка які кіраўнік утрымаецца ад спакусы абвесьціць вашыя дасягненьні сваімі, а свае памылкі — вашымі.

...

З прыказаньнем "Не пажадай чужое

жонкі" згодны нават ня той, у каго ёсьць жонка, але той, хто бачыць, што яго жонку жадаюць. А выконваць гэтае прыказаньне ахвочых яшчэ менш...

. . .

Якія там маральныя "забабоны"! Некаторых з нас можа спыніць толькі пагроза ўласнаму здароўю. Зрэшты, і такіх ня вельмі шмат.

. . .

Балюча бачыць чалавечую недасканаласьць і быць сьведкам чалавечае слабасьці — выніку гэтай недасканаласьці.

. . .

Нашая разгубленасьць пры першай сустрэчы з чалавечай подласьцю сьведчыць аб закладзеным у нас імкненьні да дасканаласьці.

. . .

Той, хто не прызнае свае хібы перад іншымі, звычайна не прызнаецца ў іх і сабе. Таму шанцаў выправіцца ў яго практычна няма.

. . .

Мы значна часьцей мяняем сваю дум-

ку, чым усьведамляем гэта. І яшчэ радзей — прызнаем яе зьмену.

. . .

Каб змагчы дурную звычку, аднаму хапае сказаць сабе "Годзе!", а другому ня хопіць і дашчэнту патаптаць сваю годнасьць, задавальняючы тую звычку. Але змагчы могуць абодва. Адзін адразу, другі — урэшце.

## МАНА

. . .

Мана існуе не таму, што людзі хочуць хлусіць. Яна існуе таму, што людзі хочуць яе чуць.

. . .

Нават самыя сумленныя дзеля аднаго чалавека здольныя схлусіць. Дзеля сябе.

. . .

Мы хлусілі б значна менш, калі б ведалі, колькі людзей нас разумеюць.

. . .

Стыль некаторых — мана.

. . .

Той, хто падманвае іншых, ня можа не падманваць і сябе. Самападман — бацька падману.

. . .

Як часта той-сёй з нас, спрабуючы давесьці, што ён "чэсны", робіць гэта з дапамогай хлусьні.

. . .

Шчырасьць — ня толькі прыкмета добрых людзей. Мярзоцьце таксама бывае шчырым.

. . .

Схлусіўшы блізкаму чалавеку, мы не прызнаемся пасьля ў гэтым ня толькі таму, што ня хочам яго засмучаць, але й таму, што пакідаем сабе магчымасьць схлусіць яшчэ раз.

## КРЫВАДУШНАСЬЦЬ

. . .

Сярод шматлікіх усьмешак, якія вам давядзецца ўбачыць у жыцьці, вельмі няшмат будзе шчырых.

. . .

Крывадушнасьць — заўсёды ўсьмешлівая.

. . .

Менавіта за самай шырокай усьмешкай хаваецца вузкае розумам.

. . .

Падхалім, цябе любіць чалавек. Але не захапляйся. Бо ўзьнясеш яго гэтак высока, што ён адтуль цябе ня ўбачыць.

. . .

З усіх сродкаў у арсэнале падхалімства лісьлівасьць найбольш цяжка замаскаваць на твары. Хацеў быў падказаць лісьліўцам, як гэта зрабіць, а пасьля падумаў — нашто? Жывуць жа яны добра і не хаваючыся.

. . .

Гэй-гэй! Чалавеча! Маеш жа дыбачкі і кукішкі. Што ж ты адразу на пузе папоўз?

. . .

Калі цябе хваляць ці моцна дзякуюць, не самападманвайся. Твая асалода можа быць усяго толькі вынікам добрага выхаваньня суразмоўцы.

. . .

Сьляпымі і дурнымі відушчых і разумных робіць падхалімства.

. . .

Не сьпяшайся судзіць таго, хто трапіў у залежнасьць ад падхаліма. Прыйдзе яшчэ і твой чарод.

. . .

Мала які розум можа процістаяць лісьлівасьці.

. . .

Улешчаны розум — зьменшаны розум.

. . .

Падхалім павінен ведаць, што чыёсьці ўлешчанае самалюбства не гарантуе яму сталага посьпеху. Заўсёды можа знайсьціся нехта больш лісьлівы і знаходлівы. Да таго ж, той, хто любіць лісьлівасьць, не абавязкова шануе лісьліўцаў.

. . .

Які бедны сёй-той! Калі б ведаў ён, як мы яго разумеем...

. . .

Можна па-рознаму ставіцца да

лісьліўцаў, але нельга не прызнаць, што лісьлівасьць амаль заўсёды дасягае мэты.

...

Некаторыя з нас больш даражаць не сваімі знаёмцамі, але сваімі знаёмствамі зь імі.

...

Ня ўсе, хто ўмее нахіляцца, робяць гэта своечасова.

## ПАДСТУПНАСЬЦЬ І ПОДЛАСЬЦЬ

...

Правільна робяць тыя, хто ўсіх вакол сябе ўважае за дурняў, бо рэдка каго з нас такім не ўдаецца абдурыць.

...

Нармальнага чалавека падступнасьць шакуе і першы і дзясяты раз.

...

Прайдзісьветам кепска жылося б, калі б не было шчырых і сумленных людзей.

. . .

Калі гутарыш з новым знаёмцам, а ён менш гаворыць, а болей маўчыць ды слухае, не сьпяшайся ацэньваць яго як засяроджанага, глыбокадумнага інтэлектуала. Магчыма, у гэты момант ён разважае над тым, як цябе лацьвей ашукаць...

. . .

Людзі, у якіх "бегаюць вочкі", у часе таго "беганьня" ліхаманкава абдумваюць, як лепш датрымаць свой інтарэс і, адначасова, схаваць гэта ад суразмоўцы.

. . .

Калі падступнік канчаткова зразумее, што ня можа падмануць, ён цябе зьненавідзіць.

. . .

Сярод тых, хто не глядзіць адкрыта ў вочы, — ня толькі тыя, каго абвінавачваюць, але й тыя, хто вінаваціць.

## УПЭЎНЕНАСЬЦЬ І САМАЎПЭЎНЕНАСЬЦЬ

. . .

Чым адрозьніваецца ўпэўненасьць ад самаўпэўненасьці? Выразам твару.

• • •

Самаўпэўненасьць таксама бывае настойлівай. Гэта — яе адзіная станоўчая якасьць.

• • •

Перакананасьць магла б быць добраю, калі б не была гэтак часта беспадстаўнаю.

• • •

Дачаснае ўсё, тым больш падставы самаўпэўненасьці.

• • •

Пакараньне самаўпэўненага — расчараваньне.

• • •

Працьверазіць самаўпэўненага можа сумнеў у сваіх сілах. Зрабі нешта лепш за яго.

• • •

На памылках вучацца самаўпэўненыя, бо яны іх больш і робяць.

• • •

Дзеячы часта займаюцца дзейнасьцю толькі з-за таго, што вельмі добра думаюць пра сябе. Прыблізна гэтак сказаў

адзін разумнік. Пагаджуся і дадам, што некаторыя "займаюцца дзейнасьцю", бо хочуць, каб пра іх добра думалі іншыя. Бо хто думае кепска пра сябе?

. . .

Варта толькі нам у чым-небудзь упэўніцца, як злахітры лёс тут жа абвяргае нашую перакананасьць у веданьні жыцьця.

## СКВАПНАСЬЦЬ

. . .

Назапашваньне — гэта схаваная амбіцыя і трансфармаваная прэтэнзія.

. . .

Сквапныя, вядома, спадзяюцца. Але галоўная іх праблема — недальнабачнасьць. Калі яны захварэюць і памруць — нават дзеці ня ўспомняць іх добрым словам.

. . .

Пытаньне, на якое ня можа адказаць сквапны, — нашто? Пытаньне, якім сквапны не цікавіцца, — каму пакінуць? Пытаньне, якога сквапны баіцца і гоніць ад сябе, — каму застанецца?

. . .

Ня толькі добрая ежа спрыяе здароўю. У некаторых выпадках яму дапамагае й голад. А бывае, што дапамагае ня сам голад, але ўсьведамленьне, колькі на ежы можна зэканоміць.

## УПАРТАСЬЦЬ

. . .

Упартасьць мае шмат "сваякоў". Яна — сястра дурноты, але бывае і крэўнаю ўдачы.

. . .

Упартасьць — пастка для дурняў. Яны трапляюць у яе часта, сядзяць там падоўгу і выбіраюцца адтуль, не паразумнеўшы.

. . .

Калі ўпартыя дамагаюцца мэты — гэта добра. Кепска, калі яны ўпарцяцца.

. . .

Лепш быць упартым, чым зацятым.

. . .

Усе кажуць "упартасьць", а думаюць "зацятасьць".

• • •

Упартыя і зацятыя, калі гавораць пра посьпех, блытаюць сябе з настойлівымі.

• • •

Упартыя, зацятыя і настойлівыя адрозьніваюцца адносінамі да сябе і людзей. Першыя думаюць аб сабе вельмі добра, другія — кепска аб усіх навокал, а трэція — добра аб сабе і недастаткова кепска аб навакольных.

• • •

Той, хто робіць усё насуперак, не заўважае, як пачынае супярэчыць самому сабе.

• • •

Той, хто з вамі ўвесь час спрачаецца, мусіў бы мець адвагу прызнацца, што ён вас калісьці зьнелюбіў.

• • •

Упартасьць часьцей бывае праяваю амбіцыі, чым вынікам перакананьня.

• • •

Не любіць упартых і тупых — мала. Трэба яшчэ самому такім ня быць.

. . .

Уларты не разумее, што для таго, каб самасьцьвердзіцца, значна важней згаджацца, чым пярэчыць.

. . .

Самыя заўзятыя пнуцца давесьці, што яны не прайгралі, нават тым, хто іх перамог.

## КАРЫСЬЛІВАСЬЦЬ

. . .

Карысьлівыя імкнуцца да моцных і ў гэтым сваім імкненьні неабачліва прамінаюць тых, хто заўтра стане яшчэ мацнейшым.

. . .

Жаданьне карысьлівых забясьпечыць сабе выгаду прымушае іх займаць месцы, дзе яны прыносяць карысьць іншым.

. . .

Значная доля ўсёй пагарды на зямлі мае тыя ж самыя матывы, што і пагарда прастытуткі, якая зразумела, што вы не яе кліент...

. . .

Перадузятасьць бывае шчырая і ўдаваная. Удаюць перадузятасьць таму, у кім зацікаўленыя.

. . .

Адмоўнае стаўленьне да прапановы можа быць пакліканае дзьвюма прычынамі — непрыняцьцем прапановы і жаданьнем яе скрасьці.

. . .

Практыцызм — не такі кепскі, калі своечасовы. Практыцызм дзіцяці можа давесьці да бяды.

. . .

Гледзячы на лёс карысьлівых, хочацца перафразаваць расейскае выслоўе і сказаць, што не яны ўпрыгожваюць месца, але месца некаторых зь іх... ратуе.

. . .

Інтарэс і выгада — распаўсюджаны, але не ўнівэрсальны матыў. Зь яго дапамогай нельга дамагчыся павагі людзей прыстойных.

## НІКЧЭМНАСЬЦЬ

. . .

Заўсёдны спадарожнік нікчэмнасьці — самападман.

. . .

У абмежаванага чалавека вузейшае ня толькі кола радасьцяў, але й перажываньняў.

. . .

Колькі разоў ужо бывала, што пасрэднасьць дзеля нечага высоўвалі наперад, а яна раптам пачынала думаць, што "перад" ёй і належыць.

. . .

Уменьне надаць сабе важнасьці ўзвышае прымітыва ня толькі ў вачах уласных, але, на жаль, і ў чужых.

. . .

Не любіць простых — не азначае самому ня быць такім.

## СЛАВАЛЮБСТВА

. . .

Славалюбца можа жорстка адпомсьціць таму, хто замахваецца на сфэру, дзе ён дасягнуў славы.

## ПАХВАЛЬБА

. . .

Прагнеш пахвалы — ведай, што хваляць не таго, хто заслугоўвае, а таго, каго трэба.

. . .

Той, хто імкнецца да пахвалы, не заўважае моманту, як у сваім імкненьні да яе пачынае ганіць іншых...

. . .

Хвалько звычайна выбірае для пахвальбы ня самую надзейную падставу.

. . .

Калі нехта хваліцца, што ён усіх паканаў, нагадай яму, што ёсьць адна асоба, якую ён не пераможа, — ён сам.

. . .

Шмат каму для камфорту трэба вельмі мала. Напрыклад, троху пахвальбы...

. . .

Маладыя ня ўмеюць хваліць, бо самі яшчэ хваляцца.

## СНАБІЗМ

. . .

Адзін толькі тып самападману падманвае ня толькі свайго носьбіта, але й некаторых навакольных — снабізм.

. . .

Снабізм і прэтэнзія — брат і сястра, а спараджае гэтых "дзетак" абмежаванасьць розуму.

. . .

Шмат каму стала б не да сьмеху, калі б яны даведаліся, што ў момант, калі яны сабе падабаюцца, іншыя зь іх сьмяюцца...

. . .

Нярэдкі ў журналістыцы тып — камэнтатар-сноб — не разумее, што памятаць будуць не яго, а падзеі, якія ён камэнтуе.

# RATIO VIVENDI

## *СЭНС ЖЫЦЬЦЯ*

### ВЕРА І ГРЭХ

. . .

Нішто на сьвеце ня мае сэнсу, апрача Бога і Вас саміх.

. . .

У пекле насельнікаў хапае, хоць на зямлі большасьць спадзяецца на рай.

. . .

Нябёсы могуць дараваць і нястрыманасьць, але кажуць, што ўзнагароджваюць яны менавіта ўстрыманьне.

. . .

Мы не пакідаем Стваральніку шанцаў ня быць міласэрным. Занадта мала сярод нас цноты.

. . .

Роспач, паводле Эвангельля, — грэх. І здаецца, што надзея пасланая нам ня толькі для таго, каб грашыць і спадзявацца, але й для таго, каб спадзявацца і не грашыць.

. . .

Непахісны закон жыцьця. Большасьць людзей кіруюцца ў сваіх учынках выключна мэркантыльным інтарэсам, але вынікі іхнае працы ўсё роўна аказваюцца станоўчымі і дадатнымі для грамадзтва. Магчыма, гэта і ёсьць Вышэйшы Плян.

. . .

Мы любім скардзіцца на свой нешанцунак і на няўвагу нябёсаў да нашага лёсу. А між тым, як часта мы супраціўляемся натуральнай хадзе падзеяў нашага жыцьця, не разумеючы, што гэта, магчыма, і ёсьць провід Божы!

. . .

Спасьцігнуць звышнатуральную бязьмежнасьць Госпада можна праз бязьмежнасьць ягонае цярплівасьці да нас...

. . .

Як часта карціць запытацца некато-

рых сьвятароў: ойча, ці чуў ты што-небудзь пра Хрыста?

...

У эвангельскім сюжэце пра Тамаша Няверная — аснова хрысьціянскага пастуляту пра безумоўную веру, гэта значыць, пра веру, якая не патрабуе доказаў. Менавіта гэтак вернікі і вераць. Але кожны зь іх недзе глыбока ў душы ўсё роўна прагне цуду. Не для доказу існаваньня Стваральніка. Для дапамогі...

...

Прыстойнасьць, на жаль, — падстава для няпосьпеху сярод людзей і ў жыцьці. Недарэмна сьвятыя сыходзілі ў пустэльнікі.

...

У хваробы ёсьць два чыньнікі: цела дае прычыну, а грэх — час і тэрмін.

...

Крыж на шыі не дапаможа таму, хто цьвёрда наважыўся зграшыць.

...

Грэх і спадарожнічае граху.

. . .

Пераадолеўшы спакусу, ня цешцеся асабліва. Яна мае звычку вяртацца.

. . .

Спакушаючыся, грэшнік можа кожнага разу пры гэтым уяўляць сябе Апосталам Пятром і спадзявацца пасьля направіцца. Пры гэтым ён забывае, што, тройчы здрадзіўшы Хрысту, Сьвяты Пётар пасьля памёр за Яго. А зь сёньняшніх грэшнікаў ніхто за Хрыста паміраць не зьбіраецца.

. . .

Спакуса — няважная. Важная перамога над ёй.

. . .

Энтрапія плянэты — грэх.

. . .

Сутнасьць Хрыстовага запавету: не зьбіраць сабе скарбу на зямлі — лепш за ўсё ўсьведамляецца намі на могілках. Якраз за цьвінтарным плотам мы аб ім і забываем.

. . .

Часам нябёсы падкідаюць нам выпраба-

ваньне ў выглядзе зьяўленьня ў нашым жыцьці таго, што мы больш за ўсё ня любім.

. . .

Нельга блытаць паняверку зь няверaю. У паняверцы чалавек часьцей за ўсё бывае не са сваёй волі, а нявера — больш суб'ектыўны, аўтарскі стан.

. . .

Мала прасіць у Госпада сілаў. Каб іх ужыць, патрэбныя і ўласныя намаганьні.

. . .

Аптымізм нараджаецца ад безвыходнасьці — ад безвыходнай колькасьці нашага граху. З нашае багны выйсьце можа быць толькі ў лепшы бок.

. . .

Шкада, але часьцей за ўсё грэх спыняецца... расплатай за яго.

. . .

Пераадоленьне сябе ёсьць пераадоленьне спакусы.

. . .

Вельмі лёгка перамагчы спакусу з другога разу, папярэдне паддаўшыся ёй.

. . .

Нібыта і нельга сумнявацца, што дастанем дараваньне нябёсаў, але й як не сумнявацца?

. . .

Грэшнікі слабыя. Але для некаторых грахоў патрэбная і сіла.

. . .

Жыцьцё можа быць да нас прыхільным, але мы забываемся, што гэта зусім не азначае прыхільнасьці да нас нябёсаў.

. . .

Грэх тым болей цяжкі, калі, робячы яго, спадзяюцца на наступнае пакаяньне.

. . .

Як часта хочацца сказаць некаторым: калі ты верыш у Бога, дык дазволь не паверыць табе...

. . .

Бяз Бога сьвет ня меў бы сэнсу.

# ДАБРО І ЗЛО

...

Няма такога зла, якому б эгаізм і амбіцыя не прыдумалі апраўданьняў.

...

Той, хто дапамагае злу, вельмі рэдка не стаецца ахвярай гэтага зла.

...

Марна дзяліць людзей. Яны дзеляцца самі. Нізкае і злое ёсьць у кожным. Паводле стаўленьня да гэтага ў сабе людзі і падзяляюцца.

...

Злыя намеры значна часьцей робяцца злымі ўчынкамі, чым добрыя — добрымі.

...

Благія мэты прыводзяць да благіх вынікаў толькі добрых людзей...

...

Цнота ня можа змагацца з заганаю ейнымі сродкамі. Па-першае, у гэтым выпадку яна перастане быць цнотаю, а па-другое, яна абавязкова прайграе, бо страціць падтрымку крыніцы сваёй беззаганнасьці...

. . .

Можна шмат разважаць над тым, чаму дабрыня заўсёды слабая і менш энэргічная. Але адказу вы так і ня знойдзеце. Бо той, каго вы лічыце энэргічным і злым, сам сябе ўважае таксама добрым.

. . .

Злая воля больш актыўная за добрую. Таму яна часта й перамагае. Але актыўная яна менавіта таму, што недзе падсьвядома разумее, што ўрэшце прайграе. Спрабуе ўратавацца.

. . .

Мы любім добрых за тое, што яны валодаюць скарбам, якога самі ня маем — дабрынёй.

. . .

Усё добра быць ня можа. А вось усё кепска — так.

. . .

Добрыя робяць дабро не таму, што трэба, але таму, што добрыя.

. . .

Зло існуе таму, што на яго ёсьць попыт. Прычым, сярод тых, хто яго папус-

кае і нават робіць яму прамоцыю, ёсьць ня толькі злыя, але й добрыя людзі.

• • •

Сярод нас нярэдка нараджаюцца абсалютна таленавітыя злом людзі. З маленства, будучы ня вельмі адукаванымі, яны ў любой сытуацыі беспамылкова вызначаюць свае прыярытэты, сваіх непрыяцеляў і шляхі іх нэўтралізацыі. Іх энэргія ня мае межаў, калі справа датычыцца іх саміх. Яны памятаюць крыўды гадамі. Яны плятуць інтрыгі супраць любога, хто, як яны адчуваюць, адчувае іх. У іх няма іншае справы, як іх справа, дзеля гэтага яны могуць ня есьці, ня спаць і не адпачываць. Іх ахвярамі часта стаюцца наіўныя, даверлівыя і амбітныя, якіх яны выкарыстоўваюць і пасьля адрынаюць ад сябе. Гэткія ёсьць паўсюль: у турме, у царкве, на вяршыні грамадзтва і на ягоным дне, сярод усіх народаў і нацыяў, ва ўсіх краінах і на ўсіх кантынэнтах. Кожны з нас можа назваць некалькі такіх падступнікаў.

Зло ўвасабляецца ў людзях, каб быць пераможаным. Пасьля многіх сваіх перамогаў... над намі.

• • •

Мы абураемся посьпехамі зла ў гра-

мадзтве і на зямлі ўвогуле і шукаем прычыну яго перамогаў. І не зьвяртаем увагі на посьпехі зла ў нас саміх, што і ёсьць прычынаю яго астатніх перамогаў.

...

Добрыя справы робяць ня толькі добрыя людзі.

...

Розьніца паміж добрым і дрэнным звычайна — у цане.

## СЯМ'Я

...

Нас часта цягне за язык жаданьне дзіцяці паведаміць кожную навіну сваёй маме.

...

Кожны хоча дапамагчы бацькам... І забывае.

...

Кепска, калі бацькі больш вытанчаныя за дзяцей.

...

Разумна паводзіцца бальшыню людзей

вучыць жыцьцё. Шчасьлівыя тыя, каго навучылі гэтаму бацькі.

. . .

Як часта нам хочацца перакласьці свой клопат на бліжняга. Лепш бы мы перакладалі яго на плечы далёкага...

. . .

Для няўдалых сям'я застаецца апошняй пляцоўкай для самасьцьвярджэньня. Для ўдалых — натуральнаю крыніцаю самапавагі.

. . .

У вялікіх бацькоў часта бываюць нікчэмныя дзеці, а ў бацькоў нікчэмных вялікія дзеці — рэдкасьць.

. . .

Людзі, якія маюць посьпех у асабістых кар'ерах, часта ня маюць яго ў выхаваньні сваіх дзяцей.

. . .

Ня варта казаць дзецям, што людзі кепскія. Кажэце ім, што людзі робяць кепскія ўчынкі. Кажэце таксама, што ім давядзецца сустрэцца з кепскімі людзьмі, і верагоднасьць гэтага вельмі вялікая.

. . .

Разумныя бацькі — гэта ня тыя, якія проста скажуць дзіцяці: змагайся, усе месцы занятыя, — але тыя, што навучаць яго самому ствараць месцы...

. . .

Нашыя дзеці павінны быць гатовыя да таго, што ў сьвеце ўсё значна прасьцей, чым яны думаюць. Пры гэтым ім самім быць "простымі" не абавязкова. Дастаткова ведаць пра "простых" і "простае".

. . .

Куды зьнікаюць нашыя пачуцьці? Куды дзяецца любоў усіх дзяцей да іх мамаў? Можа, адзіны шанец ўратаваць пачуцьцё — гэта матэрыялізаваць яго ва ўчынкі?

. . .

Адзін толькі тып людзей дарue несправядлівасьць да іх і ня помсьціць за яе — родныя.

## ЧАС

. . .

Людзі, якія апярэджваюць свой час, павінны быць гатовыя да помсты "апярэджаных".

. . .

Выраз "настальгія па тых часах" не зусім слушны. Настальгуем мы хутчэй не "па тых часах", а па сабе тагачасных.

. . .

Усё ідзе хутчэй, чым мы думаем. Усё хутчэй і здарыцца.

. . .

Чаканага толькі таму і чакаюць, што яно можа ня зьдзейсьніцца.

. . .

Дзеці і дарослыя — часавыя ворагі. Адныя прагнуць час прысьпешыць, а другія — спыніць ці запаволіць.

. . .

Кажуць, што час ідзе, бяжыць, ляціць... Кажуць нават, што яго выпраменьваюць зоркі... А што, калі ўзяць такі ракурс — час выцякае, канчаецца. Літаральна для кожнай істоты і, увогуле, для ўсяго, што мае шчасьце ці няшчасьце быць, яго застаецца ўсё меней. Таму я і кажу — часу меншае. І для таго, хто яшчэ не нарадзіўся, часу таксама меншае. І да зьяўленьня, і да сьмерці.

* * *

Кажуць, як чакаць — дык доўга, а як прайшло — дык хутка. Ня маюць рацыі, або часткова маюць. Усё ўвогуле хутка.

* * *

Чым больш падзеяў за адзін дзень — тым ён даўжэйшы. А вось чым болей працы — тым дзень карацейшы.

* * *

Адзін разумнік некалі сказаў, што менавіта праца зрабіла з малпы чалавека. Я б не ацэньваў працу так адназначна. Менавіта яна забірае большую частку нашага жыцьця.

* * *

Неразумны той чалавек, які не заўважае хады часу. Ён бо яго і не шкадуе.

* * *

Залежнасьць ад часу людзі пачынаюць адчуваць тады, калі яго не стае.

* * *

Адзіны сродак павялічыць свой час — напоўніць яго падзеямі.

...

У кожным чаканьні самы пакутлівы час — апошні.

...

Не сьпяшаюцца — маладыя і... дурныя.

...

Дзьве рэчы сыходзяць незваротна — час і грошы.

...

Частка людзей валодае рэдкай здольнасьцю заўсёды знайсьці нейкую справу, каб згубіць троху часу.

...

Страціўшы час, людзі не разумеюць, што згубілі і шанец, і яшчэ доўга не пакідаюць марных надзеяў.

...

Самападманам займаюцца тыя, хто спадзяецца нагнаць страчанае. Час, які вы ахвяравалі не на тое, — вы ахвяравалі не на тое...

...

Калі мы спрабуем нешта адкласьці ці

адцягнуць, мы наіўна не разумеем, што скарачаем наступны кавалак адпушчанага нам часу...

## СЬВЕТ І СУСЬВЕТ

...

Гэтым сьветам кіруе ня той, хто павінен быў бы, і ня тое, што павінна было б. Таму неразумна нечага дамагацца. Трэба проста жыць. Усё, што мы можам — гэта заставацца такімі, якімі мы ёсьць. Менавіта гэтага найбольш ня хоча тое, што тут кіруе.

...

У сьвеце панаваў бы хаос, калі б частка людзей не была створаная для таго, каб задаволіцца малым.

...

Фатальнага ў нашым жыцьці значна менш, чым мы думаем. Часта абставіны штурхаюць нас на пэўны выбар. Але, добра падумаўшы, вы зразумееце, што тыя абставіны справакавалі самі.

...

Сьвет мяняецца, мяняюцца людзі, мя-

няюцца словы, якімі яны выказваюць свае пачуцьці. Не мяняюцца толькі самі пачуцьці. Кожнаму наканавана зазнаць расчараваньне, нязьдзейсьненыя мары і невымоўны боль ростані з блізкім і дарагім.

...

У сусьвеце чалавечых пачуцьцяў больш за ўсё лунае — жаданьняў, а сярод іх — жаданьняў нязьдзейсьненых.

...

Усё, што існуе на зямлі: рэчы, ідэі і вычварэнствы, — усё гэта некаму патрэбнае. Няма нічога непатрэбнага.

...

Не сумнявайся, што ўсё паўтараецца. Усё паўтараецца.

...

Вечнае — нядобразычлівец побач з вамі.

...

Сьветам кіруюць ня лепшыя якасьці людзей, а паветра, насычанае іх нялепшымі памкненьнямі.

. . .

Бясконцасьць сусьвету немагчыма ўявіць таму, што ён — і не бясконцы.

## ІНТЭЛЕКТ

. . .

Робячы высновы, не забудзься, што кожная зь іх — дачасная.

. . .

Тое, што мы зразумелі, застаецца і сыходзіць разам з намі. Шчасьлівы той, хто здолеў гэта перадаць іншым. Назапашанае перадаць лёгка, зразуметае — амаль немагчыма.

. . .

Інтэлектуалы шмат хочуць ад людзей.

. . .

Інтэлектуал не заўважае, што перарос сваіх кумíраў, і расчароўваецца ў іх, замест таго, каб падзякаваць.

## НАДЗЕЯ

. . .

Недаўменьне — чаму ж здарылася бяда, ёсьць маленькаю рэштаю нашае надзеі на тое, што яна ня здарыцца...

. . .

Калі надзея й не дапамагае нам добра жыць, дык, прынамсі, яна дапамагае нам лепш чуцца.

. . .

Сумнеў азмрочвае надзею, а надзея робіць сумнеў менш пакутлівым.

. . .

Калі няма нічога іншага, мы песьцім сваё самалюбства надзеямі.

. . .

Надзея, не падмацаваная верай ці ведай — шкодная, бо падманвае. Тое, што мы трацім, мы трацім назаўсёды.

## ПРЫГАЖОСЬЦЬ

• • •

Прыгожае — захапляе і цешыць. Але можа і раздражняць. Таго, хто яго ня мае.

• • •

Хоць усе і ня могуць быць прыгожымі, але мала хто сябе такім не ўважае.

• • •

Прыгожыя ўнутрана людзі вельмі часта бываюць непрыгожыя зьнешне. І наадварот.

• • •

Прыгожае ня толькі песьціць вока і цешыць густ, але і спакушае.

• • •

Звычка робіць прыгажосьць менш заўважнаю.

• • •

Насамрэч людзей якія здольныя адрозьніваць прыгожае ад непрыгожага, — вельмі мала.

## АДВОЛЬНАЕ

. . .

Магчы — прыемна.

. . .

Прыемна, калі выпадковасьць на нашым баку...

. . .

Бывае, нам адмаўляюць у тым, чаго мы ня просім.

. . .

Губляесься, калі адчуваеш, што табе чужая чужая радасьць.

. . .

І самыя лепшыя аказваюцца самымі звычайнымі.

. . .

Пытаньне ня ў тым, можаце вы ці не. І ня ў тым, што і як. Пытаньне ў тым — ці трэба?

. . .

Галоўнае, не адкуль вы. Галоўнае — дзе вы.

. . .

Кожны хоча, каб вы ім пацікавіліся. Дзеля розных мэтаў, але кожны.

. . .

Першы блін — заўсёды комам, але не ва ўсіх.

. . .

Мецъ патрэбу — мала. Трэба, часам, і атрымліваць.

. . .

Зялёная агароджа ўвосень перастае быць зялёнаю, а ўзімку — агароджаю.

. . .

Быць прасьцей ня могуць... простыя.

. . .

*1. I. 1999.*

. . .

Ня ўсе знаёмыя людзі могуць сказаць адно аднаму: мы з вамі сустракаліся ад-

нолькавую колькасьць разоў — колькі вы са мной, столькі і я з вамі...

. . .

Калі нешта добра камечыцца, гэта ня значыць, што яно добра прасуецца.

. . .

Станоўчы імідж — ня тое самае, што станоўчы вынік.

. . .

Своечасова спыніцца — гэтак жа важна, як і мець адвагу пачаць ізноў.

. . .

Ёсьць усё, што мы здольныя назваць, і яшчэ шмат з таго, што мы назваць ня можам.

. . .

У тыдні вельмі шмат будзённых дзён, а ў месяцы вельмі мала тыдняў.

. . .

Не хваліцеся, што здымаеце кватэру з мэбляй — маеце рызыку памерці не ў сваім ложку.

. . .

Калі мы стаім на беразе, нашыя

позіркі рэдка скіраваныя на яго. Мы глядзім на супрацьлеглы.

...

Лепш за ўсё ў дарагіх рэчах разьбіраецца той, хто іх прадае, і сам ня мае грошы купіць.

...

І ў адчыненыя дзьверы не заўсёды можна заходзіць.

...

Слова "трэба" пагарджае нашымі жаданьнямі.

...

Нікому нічога ня трэба даводзіць. Той, хто здольны ўспрымаць аргумэнты, і так на вашым баку.

# VITA ARTIUM
*мастацкае жыцьцё*

## ТАЛЕНТ

. . .

Талент бывае адзінаю станоўчай якасьцю свайго ўладальніка.

. . .

Эгаізм, бясспрэчна, зьяўляецца найлепшым пабуджальнікам да працы. Але толькі ў бяздарнасьцяў. Сярод матывацыяў генія — ня толькі эга. Ёсьць там і ягоны... адказ сьвету.

. . .

Тое, дзеля чаго чалавек застанецца ў гісторыі, ён робіць не таму, што трэба, але таму, што хоча.

• • •

Той, хто не імкнецца ўвекавечыць сваё імя, часта мае на гэта больш шанцаў.

• • •

Той, хто здольны ацаніць, звычайна сам застаецца недацэненым.

• • •

Талент і розум — розныя рэчы. Яны часьцей за ўсё і належаць розным людзям.

• • •

У таленавітым розуме прэтэнзія пасяляецца радзей.

• • •

Талент шмат глядзіць і слухае. Нехта гаворыць, ён — піша.

• • •

Як часта разумныя і глыбокія на слых словы, перанесеныя на паперу, аказваюцца бляклым прымітывам...

• • •

Крытычнасьць і крытыцызм адрозьніваюцца... талентам. А таксама розумам, пачуцьцём меры і стылем.

. . .

Талент ніяк не залежыць ад яго носьбіта.

. . .

Пыха, магчыма, і спрыяе ўдачы, але таленту не дадае.

. . .

Геніяў не пазнаюць адразу, бо ўсе яны пачынаюць як нармальныя людзі.

. . .

Малады геній заўсёды патрабуе прызнаньня ад тых, хто сам "геній", і якраз таму ня можа прызнаць такога ж новага...

. . .

Абставіны могуць зьбегчыся такім непрадказальным чынам, што нават поўная пасрэднасьць уявіцца нам геніяльнасьцю.

. . .

Прымітыўнасьць учынкаў не залежыць ад узроўню таленту. Нават вельмі таленавітыя рэфлексуюць вельмі прымітыўна. Уся справа ў самапавазе і пысе, якія ў чалавеку спараджае ўсьведамленьне свайго таленту.

. . .

Роля працы рэзка ўзрастае пры адсутнасьці таленту. Затое роля таленту пры наяўнасьці працы рэзка зьмяншаецца.

. . .

Талент пазнаецца паводле вынікаў, а не паводле думкі "таленавітага" аб сабе.

. . .

Памыляецца той, хто думае, што ўсё ў чалавеку можна зьмяніць. Можа і можна, напрыклад, нашыя здольнасьці разьвіць ці загубіць, але сама іх наяўнасьць залежыць усё ж ад нябёсаў.

## ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

. . .

Шмат што са створанага на зямлі — насамрэч падслухана ці падгледжана.

. . .

Самы ўважлівы чытач — аўтар. Самы ўдзячны — таксама ён.

. . .

Мастакамі (нават тымі, што пішуць пра вайну) рухае настальгія. Разьвітаньне — вось матыў, і прадмет, і сродак!

* * *

У вялікіх мы часта шукаем пацьверджаньня сваіх думак. Мы і вялікімі іх прызнаем, бывае, за тое, што іх думкі супадаюць з нашымі.

* * *

Творчасьць — гэта таямніца, якую творца толькі прыўлашчвае.

* * *

Ад творцы залежыць толькі прадукцыйнасьць, але ня якасьць.

* * *

Публіцыстыка і творчасьць — сумяшчальныя. А публіцыстыка і мастацтва — не. Мастак дамагаецца сваіх мэтаў, не называючы іх.

* * *

Антыпатыя таксама бывае крыніцаю творчасьці. І яшчэ якой...

* * *

Апалягетыка — доля многіх. Толькі адзінкі ўздымаюцца да апалёгіі.

* * *

Веліч мастака — гэта веліч ягонае

рэфлексіі, а не ягонае асобы. Асобы ў вялікіх часта — драбнюткія.

...

Юр, часам, выклікае станоўчую рэфлексію.

...

Узьняцца да агульнага нам дапамагае асабістае.

...

Некаторыя пачынаюць пісаць ад празьмернай культуры.

...

Бывае, лягчэй стварыць новы жанр, чым зрабіць посьпехі ва ўжо вядомым.

...

Той, хто пачынае пісаць, стаецца на небясьпечны шлях. Далей ён будзе ісьці па лязе. Яго душа будзе разрывацца паміж прагай прызнаньня і сумненьнем: ці тое, што ён робіць — вартае? Не зайздрошчу пісьменьнікам. А калі нейкі зь іх і не сумняецца ў вартасьці зробленага, яму не зайздрошчу ўдвая.

...

Можна сказаць. Трэба, каб яшчэ па-

чулі. Тут два шляхі — аўтарытэт і гучнасьць голасу.

• • •

Калі пры першай сустрэчы літаратар ня кідаецца чытаць вам свае вершы, гэта зусім не азначае, што ён ня ёсьць літаратурным маргіналам зь неспатоленай прагай прызнаньня і пашаны. Магчыма, ён проста чакае, калі вы яго аб гэтым папросіце.

• • •

Парадокс. Усе любяць гаварыць пра сябе. Каб падабацца людзям, трэба гаварыць пра іх. Але калі вы ня будзеце гаварыць пра сябе, аб вас ніхто не даведаецца.

• • •

Бывае, што творца пачынае верыць у свой посьпех тады, калі пра яго ўжо пачынаюць забываць. Ён чакае акцэптацыі, а да яго ўжо прывыклі.

• • •

Посьпех пераменлівы. Ён заўсёды сыходзіць раней, чым самапавага, якую спараджае ў творцы.

. . .

Адна з самых брыдкіх якасьцяў у творцах — гэта іх шчырая перакананасьць у велічы свайго таленту.

. . .

Няма нічога горш за крыўдлівую амбітнасьць творцы.

. . .

Аднолькавыя — помста кінутае жанчыны і помста неасьцярожна пакрыўджанага творцы.

. . .

Ня верце паэту! Ён зайздросны чужому посьпеху.

. . .

Творцу сябар той, хто прызнае ягоны талент.

. . .

Пустым можна назваць паэта, які блытае вершы і зарыфмаваную патрыятычную рэфлексію.

. . .

Спалучэньне рашучасьці і асьцярожнасьці робіць мужчыну сапраўдным муж-

чынам. А вось спалучэньне нерашучасьці і неасьцярожнасьці робіць мужчыну... пісьменьнікам.

• • •

Я дацэньваю твае высілкі, але іх плён мне настолькі нецікавы, што я нават нічога не хачу ведаць аб ім. Менавіта гэтак хочацца сказаць шмат каму з нашых пісьменьнікаў. Але сказаць так — было б вяршыняю неасьцярожнасьці і глупства. Мы асуджаныя на крывадушнасьць.

• • •

Цяжка знайсьці творцу, які б не падзяляў людзей паводле іх стаўленьня да ягонае творчасьці. Як і цяжка знайсьці творцу, сэрца якога нельга было б заваяваць пахвальбой ягонага даробку.

• • •

Выглядае, што чым большы маштаб творцы, тым менш яму залежыць на прызнаньні чытачоў.

• • •

Некаторыя ня могуць, але вельмі хочуць. І ў выніку — робяць. І ў справах іхных нешта ёсьць, але нечага і няма. І няма якраз таго, што ёсьць у тых, хто можа.

• • •

Наколькі некаторыя людзі разумныя на паперы, нагэтулькі ж яны дурныя ў размове.

• • •

Трапнае ўвогуле цьверджаньне, што мастацтва і надзённасьць несумяшчальныя, губляе сваю рацыю на самым прымітыўным узроўні — на ўзроўні фальклёру.

• • •

Добра, калі чалавек пазычае чужыя думкі. Кепска, калі ён выдае іх за свае. І яшчэ горш — калі не прызнае факту пазыкі і няўдзячыць сапраўднаму аўтару думкі.

• • •

Той, хто крадзе чужыя думкі, павінен быць гатовы да таго, што і ў яго іх могуць скрасьці.

• • •

Колькі трэба напісаць, каб недарэмна пражыць дзень? Той, хто так ставіць пытаньне, якраз рызыкуе пражыць дзень дарэмна. Зрэшты, ёсьць выключэньні.

. . .

Бяздарны творца ніколі не бывае лянівым. Часьцей гэта — працавіты пэдант.

. . .

Некаторым пісьменьнікам рана пісаць. Ім яшчэ трэба чытаць.

. . .

Таму, хто чытае, няма часу ствараць.

. . .

Праблема многіх рэдактараў у тым, што яны самі — аўтары.

. . .

Ня толькі чытач, бывае, зайздросьціць аўтару, але і рэдактар.

. . .

Некаторыя аўтары любяць сябе гэтак моцна, што ня могуць выкінуць нічога з напісанага імі.

. . .

Людзі, што захоўваюць кожны напісаны імі радок, занадта добра думаюць аб сабе.

. . .

Каб берагчы аўтограф, трэба ня быць знаёмым зь яго аўтарам.

. . .

Твор удалы тады, калі ён на некаторы час пазбаўляе нас магчымасьці чытаць наступны.

. . .

Перакладчыкі часта больш віртуозна валодаюць сваёй мовай, чым аўтары, якіх яны перакладаюць, сваёй. У выніку часта мы нічога ня можам сказаць пра пачуцьцё мовы і стылю таго, каго чытаем у перакладзе.

. . .

Больш памятаюць таго, хто стварае, а не таго, хто камэнтуе створанае.

. . .

Камэнтатар прыўлашчвае значнасьць падзеі.

. . .

Няма такога актора, які не хацеў бы стаць рэжысэрам... Але ня ўсе могуць. Хто ня можа, той кажа, што ня хоча.

. . .

Калі ідзе пра посьпех ў тэатры і на эстрадзе, дык я заўважыў, што варта чалавеку трапіць у памяшканьне са сцэнай, і ён абавязкова папляскае ў ладкі.

. . .

Ня ўсе разумеюць, што для актора кожны спэктакль — бэнэфіс.

. . .

Па-за спэктаклямі акторы граюць саміх сябе.

## МАРАЛІСТ І АФАРЫЗМ

. . .

Рэдка які мараліст не паспрабаваў сябе ў ролі незразуметага навакольлем мэнтара.

. . .

Пісаць афарызмы і раздаваць у іх парады значна лягчэй, чым гэтыя парады выконваць.

. . .

Афарызм — доля самотных... — хацеў напісаць я, ды пасьля падумаў — а

хто не самотны? Афарызм, як і шмат што — плён самоты.

. . .

Не сьпяшайцеся. Спрэчны афарызм ня толькі можа быць бясспрэчным для яго аўтара, але яшчэ мае шанец стацца такім і для вас.

. . .

Хочацца, каб аб'екты афарызмаў пазнавалі ў іх сябе. Але не пазнаюць. Таму і стаюцца пэрсанажамі маралістаў.

. . .

Пара пісаць афарызмы надыходзіць тады, калі вы пачынаеце разумець пра людзей болей, чым яны самі пра сябе разумеюць.

. . .

Цынізм часта спараджае афарызм.

. . .

Багатая афарызмамі мова бывае ў пакрыўджанага, ці, прынамсі, незадаволенага... арыстакарата.

. . .

Афарызмы будуць пісацца датуль, дакуль будзе ў чым расчароўвацца. І каму.

. . .

Пакуль аўтары афарызмаў назіраюць і вывучаюць жыцьцё... нехта жыве.

. . .

Афарызм — гэта заўсёды разьвітаньне зь ілюзіяй.

. . .

Аўтары афарызмаў — пустэльнікі.

. . .

Ня кожную з думак трэба занатоўваць, ня гледзячы нават на тое, што большасьць зь іх — ніколі ня вернецца.

. . .

Колькі афарызмаў напісаў маараліст — столькі разоў ён расчароўваўся.

. . .

Маралісты працягваюць пісаць афарызмы таму, што ў кожным папярэднім ім нечага не хапае.

. . .

Афарызмы пішуць тыя, каму маўчаць ня сумна.

. . .

Чым больш асабістая рэфлексія мара-

ліста — тым менш папулярная яго творчасьць. Зрэшты, усё залежыць ад калібру асобы.

• • •

Камічна, калі мараліст знаходзіць натхненьне ва ўласнай сям'і.

• • •

Аўтары афарызмаў часта блытаюць дасьціпнасьць з дасьціпнай зьедлівасьцю. У другім выпадку многія зь іх больш шчырыя.

• • •

Эпатаж можа зрабіць творцу ідалам у вачах публікі і геніем ва ўласных вачах. Тое самае ў выпадку мараліста можа аказацца неразуменьнем чытача і блазенствам у вачах уласных.

• • •

Нельга выціснуць зь сябе афарызм. Да яго трэба дажыць.

• • •

Зрабіць мярзотніка пэрсанажам зьедлівага афарызму — ня горшы варыянт адказу на крыўду.

. . .

Як часта хочацца сказаць непаважна аб паважных людзях!

. . .

Ня ўсе пачуцьці дазваляюць сфармуляваць сябе ў словах. Якраз гэта ратуе некаторых маіх знаёмцаў.

## СЛОВЫ

. . .

Цана словам — невысокая, бо залежыць не ад словаў, але ад людзей, якія іх кажуць.

. . .

Кожная думка ёсьць завершанаю. Незавершанымі бываюць словы.

. . .

Бывае, цана словам большая для таго, каму іх кажуць, чым для таго, хто кажа.

. . .

Як часта людзі давяраюць сваю крыўду паперы! Дарэмна. Тыя, да каго яны пішуць, вельмі рэдка ім шчыра спачуваюць і яшчэ радзей могуць дапамагчы. І

атрымліваецца, што іх боль бывае блізкі й зразумелы толькі таму, хто праз 50 ці 100 гадоў чытае тыя лісты ў архіве...

## ГУСТ І МЕРА

. . .

Стыль — вышэйшы за шмат што ў чалавеку і зьяўляецца такой жа надпрыроднай таямніцай, як і талент.

. . .

Узбуджаны сытуацыяй маргінал, звычайна, ня мае пачуцьця меры.

. . .

Найважнейшае — пачуцьцё меры. Той, хто гэтага не разумее, якраз яго й ня мае.

. . .

Высокі стыль у мове бывае пакліканы, каб схаваць грэх.

. . .

Прага славы і грошай ня лічыцца з эстэтыкай.

. . .

Натоўп ня мае густу.

. . .

Меў рацыю Вавэнарг, калі пісаў, што моду фармуюць як цноты, гэтак і заганы, хібы. Паколькі пакаленьні адмаўляюць адно аднаго, а зь імі мяняецца і мода, дык трэба прызнаць, што ёсьць няўдалыя пакаленьні. Іх мода пакліканая да жыцьця заганамі і неправотамі.

. . .

Мода мае сэнс спачатку.

. . .

Прэтэнзія пры адсутнасьці густу пакідае горшае ўражаньне, чым, напрыклад, адсутнасьць і густу, і прэтэнзіі.

. . .

Пачуцьцё меры здраджвае нават тым, хто яго мае.

. . .

Кажуць, прэтэнзія — гэта безгустоўна. Выглядае, што яна — таксама стыль. Стыль разумовай абмежаванасьці.

. . .

Часам здаецца, што галоўная праблема людзей — адсутнасьць пачуцьця меры.

. . .

Хоць і кажуць "аб густах і колерах не спрачаюцца...", але густ і мера існуюць аб'ектыўна, і аднаму яны дадзеныя, а іншаму — не.

. . .

Скандал — спадарожнік экстравагантнасьці.

## КУЛЬТУРА

. . .

Нецярплівасьць — памылка некультурных і адна з прыкмет малой культуры.

. . .

Розум — у тым, каб своечасова пачаць, а культура — каб своечасова спыніцца.

## КНІГІ

. . .

Кнігі бацькоў рэдка аказваюцца патрэбнымі іх дзецям.

. . .

Кніга — асабістая рэч.

. . .

Тыя бацькі шчасьлівыя, пасьля сьмерці якіх дзеці не прадаюць іхныя кнігі. І яны ж найбольш удалыя выхавальнікі.

. . .

Нішто і ніколі не заменіць чалавеку кнігу. І гэта таму, што галоўная Кніга — Біблія, была дадзеная нам менавіта ў форме кнігі, а ня ў выглядзе кампутарнай дыскеты, лязэрнага дыску ці відэастужкі.

# VITA PUBLICA
# *грамадзкае жыцьцё*

## ГРАМАДЗТВА

...

Каб навязаць людзям свае погляды, не абавязкова выказваць іх уголас.

...

Трагедыя чалавецтва палягае на тым, што частка людзей адстойвае свае погляды, падсьвядома, а часам і сьвядома ведаючы, што яны памылковыя.

...

Калі нехта абяцае прынесьці вялікую карысьць грамадзтву, можна не сумнявацца, што яшчэ большую карысьць ён прынясе сабе.

...

Перш чым агітаваць "за", трэба добра

ўцяміць, што пераважную большасьць рэчаў у сваім жыцьці людзі робяць насуперак.

• • •

Колькі надзеяў віруе ў галовах згоднікаў! А між тым, рэдка якія зь іх не падрыхтаваў сабе пагібель, патураючы сваволі тырана.

• • •

Нават калі тыранія мае самы паслухмяны і абыякавы народ, яна сёньня ня мае шанцаў абвесьціць сябе богаабранаю. На гэта ўжо ня хопіць людзкое дурноты.

• • •

Сам народ памірае. Не паміраюць толькі некаторыя ягоныя якасьці. Тыя, напрыклад, што дазваляюць назваць яго натоўпам.

• • •

Розьніца паміж кіраўніком калектыву зь пяці чалавек і прэзыдэнтам краіны мінімальная. Іх яднае ігнарацыя інтарэсаў падначаленых.

• • •

Інстынкт самазахаваньня грамадзтва

прымушае яго высоўваць на вяршыню таго, хто здольны непрыняцьцем сябе актывізаваць нават самую індыфэрэнтную публіку.

...

Параноікі ўспрымаюць сябе занадта сур'ёзна. Гэта і ёсьць прычына іх посьпеху.

...

У кожнай суполцы, руху ці грамадзе ёсьць людзі, якія прагнуць яе ўзначаліць, але ніколі так і не патрапяць гэтага зрабіць.

...

Некаторыя шукаюць аднадумцаў толькі для таго, каб іх узначаліць.

...

Самы распаўсюджаны ў людзей тып кіраўніка — амбітны невук.

...

З асаблівым імпэтам мы ўшаноўваем і адстойваем тых, чые гучныя імёны робяць гонар партыі, у якую ўваходзім мы самі, — напісаў некалі Вавэнарг... практычна пра ўсіх маіх знаёмцаў.

. . .

Матывы і памкненьні ў людзей аднолькавыя. У іх розны інтэлектуальны ўзровень і, адпаведна, — розныя шляхі і формы рэалізацыі сваіх памкненьняў. Дэфіцыт маралі ў спалучэньні з прымітыўнасьцяй мысьленьня спараджае нізкамаральныя мэты і крымінальныя шляхі іх дасягненьня.

. . .

Дзіцяці цалкам хапае прызнаньня мамы, а пасьля — бацькоў. Па меры таго, як яно сталее, рамкі патрэбнага прызнаньня пашыраюцца на клясу, школу, двор, вуліцу. У дарослых гэтая прага, часам, выходзіць на нацыянальны ўзровень. А ў некаторых вар'ятаў — на сусьветны, плянэтарны.

. . .

Назапашаныя чалавекам веды і досьвед вельмі часта не перадаюцца нашчадкам і адыходзяць разам зь іх носьбітамі ў нябыт. І вельмі добра. Інакш бы наступныя пакаленьні мелі значна менш энэргіі і ахвоты нешта спазнаваць і да нечага імкнуцца.

. . .

Пэўная катэгорыя дзеячоў мае ўсьвя-

доміць сабе, што цынізм — мэдаль двухбаковы. Ён ня толькі дапамагае свайму носьбіту перамагаць, але й робіць яго патэнцыйнай ахвярай аднадумца.

...

На вяршыні кар'еры — адстаўка.

...

Шмат каго з нас ратуе атачэньне. Калі б не яно, цяжка ўявіць, кім бы сёй-той стаў і дзе апынуўся. Асяродзьдзе — ня горшы выхавальнік.

...

Кансэрватар — ня толькі датрымлівае свае звычкі. Ён датрымлівае свае неправоты.

...

Мы агулам наракаем на кансэрватараў, забываючы, што каштоўнасьць некаторых рэчаў для нас заключаецца менавіта ў іх нязьменнасьці.

...

Лідэрам уласьціва дадатнае для іх асабіста блытаць з агульнай карысьцю.

...

Некалі Піфагор сказаў, што ня трэба разважацца з дзецьмі, жанчынамі і народам. З таго часу зьмянілася ўсё, засталася нязьменнай толькі піфагорава рацыя.

...

Дэмагогія — шлях да сэрца народа.

...

Выкарыстаньне дэмагогіі ў палітычнай барацьбе наўпрост залежыць ад маральнага ўзроўню барацьбітоў. Залежнасьць простая: чым больш дэмагогіі — тым менш маралі.

...

Дэмагога, у прынцыпе, можна пазнаць па твары. Дэмагог — заўсёды нахаба.

...

Дэмагогія — гэта дзейсны сродак для заваяваньня сымпатыяў плебсу таму, што запатрабаваньні ды інтарэсы плебсу — дэмагагічныя па сваёй сутнасьці: таму, хто цікавіцца каўбасой, яе і абяцаюць.

...

Народ, які не бароніць сваю дзяржаву са зброяй у выпадку сьмяротнай для яе пагрозы, ня варты гэтай дзяржавы.

. . .

Нацыяналіст — гэта той, чыя краіна не адпавядае ягоным уяўленьням.

. . .

Як і ўсе людзі, нацыяналісты таксама стамляюцца. Нацыянавацъ.

. . .

Пасьпяховыя палітыкі працуюць з народам, які ёсьць. Нацыянальныя апазыцыйныя палітыкі працуюць з такім народам, які яны хацелі б мець.

. . .

Патрыятызм — гэта ня тое самае, што любоў і замілаваньне да радзімы. Высокая патрыятычная рэфлексія, на жаль, можа быць уласьцівая і апошняму хаму.

## СПРАВА

. . .

Ня ўсе справы робяцца рукамі тых, хто іх робіць.

. . .

Нязробленая справа раздражняе, а зробленая — цешыць.

• • •

Справа патрабуе пашаны.

• • •

Няважна, хто калі пачаў. Важна — хто што робіць.

• • •

Адзін цешыцца, што разумее, а другі — што робіць.

• • •

Разумее — шмат хто. Мала хто робіць.

• • •

Колькі б людзей не пачыналі справу, калі б ведалі, да якіх стратаў і расчараваньняў яна давядзе!

• • •

Дурны весяліцца, разумны сьмяецца, спраўны — робіць. У вольны ад працы час ён успамінае, як быў разумным і сьмяўся з дурняў.

• • •

Калі вы нечага ня робіце, няважна, чаму вы гэтага ня робіце. Вы гэтага ня робіце, а нехта зробіць.

. . .

Бяз нашых фантазіяў нам заставалася б толькі сумная рэчаіснасьць. Але ставімся мы да іх па-рознаму. Адны з нас хаваюцца ў летуценьнях ад рэчаіснасьці, а іншыя ўсяляк намагаюцца скараціць адлегласьць паміж імі.

. . .

Чым больш прымітыўная і дробная асоба, тым больш важнаю стаецца справа, якую яна робіць.

## ПРАЦА І ГРОШЫ

. . .

Ня важна, якую працу робіш, важна — як.

. . .

Толькі той, хто мае вялікія грошы, разумее, якая гэта... драбяза.

. . .

Нельга сказаць, што ўсе працавітыя — пасьпяховыя. А вось тое, што ўсе пасьпяховыя — працавітыя, — так.

. . .

Розныя спосабы дэманстрацыі сваёй

незалежнасьці часта пакліканыя, каб схаваць толькі адну залежнасьць — ад грошай.

...

Праца і ўзнагарода — адваротна адэкватныя. Чым больш грошай праца прыносіць — тым яна лягчэйшая.

...

Мы залежым ад грошай. Але найбольш ад іх залежаць тыя, хто не разумее, што і грошы, асабліва іх наяўнасьць і колькасьць, таксама залежаць ад нас.

...

Лічыцца, што грошы не прыносяць шчасьця. Сапраўды, гэта мы пачынаем адчуваць, калі грошы ёсьць, і канчаткова ўсьведамляем, калі грошы канчаюцца.

...

Ад грошай залежаць і тыя, у каго іх няма, і тыя, у каго яны ёсьць. Толькі другія больш.

...

За многім вакол нас стаіць нашмат больш людзкое працы, чым мы думаем. Нам уласьціва ня толькі недаацэньваць

людзей ды іхны плён, але й іхныя высілкі. І ўсе з нас, нават пэрсоны з заніжанай самаацэнкаю, схільныя свае ўласныя намаганьні перабольшваць.

...

Простую праўду пра тое, што грошы трацяцца значна лягчэй, чым зарабляюцца, трэба памятаць ня толькі тады, калі іх траціш, але й тады, калі іх зарабляеш.

...

У прынцыпе, усё чалавецтва падзяляецца на тых, хто грошы дае, і на тых, хто грошы бярэ.

...

Той, хто ня можа ашчадна распарадзіцца трыма шэлегамі, змарнуе і мільён.

...

Мала хто любіць бедных сваякоў, і мала хто зь іх ня любіць сваякоў багатых.

...

Мы часта плацім, забыўшы пра прынцып: "Я заплачу вам тады, калі гэта будзе трэба мне, а ня вам".

. . .

Нам столькі ўсяго трэба, што надыходзіць час, калі трэба сказаць сабе — стоп, табе нічога ня трэба.

. . .

Мы наракаем на занятасьць і разумеем, якім яна была шчасьцем, толькі тады, калі застаемся па-за справамі.

. . .

Цяжка не лічыць чужыя грошы таму, хто сваіх ня мае.

. . .

Траціць грошы ўмеюць усе, ня ўсе знаюць іх ашчаджаць.

. . .

Праца не надае здароўя. Яго надаюць яе вынікі.

. . .

Эканомія, бывае, прыносіць страты.

## ПАЛІТЫКА

. . .

Дзеці ня любяць кашу, скажам, грэч-

ку ці панцак. І таму неразумна пытацца ў іх: "Хочаш кашкі?" Трэба пытацца: "Будзеш грэчку халодную, ці табе падагрэць?" Ня трэба пакідаць ім выбару, дайце ім выбар бяз выбару. Падобны падыход стасуйце і ў палітыцы, і да ўсяго на сьвеце. І будзеце мець посьпех. Сярод дарослых.

. . .

Грамадзянская супольнасьць — гэта калі нават тыя, каму няма чаго есьці, выходзяць на мітынгі ў абарону правоў чалавека.

. . .

Пасьля трыццаці рэвалюцыянэры павінны кідаць рэвалюцыю. Хто ня кідае — у таго інфантылізм, няслушнае выхаваньне або... пакліканьне. І тады ёсьць падставы гаварыць пра ролю асобы ў гісторыі або пра гісторыю хваробы.

. . .

Узор фальшу — абдымкі палітыкаў і іхныя ўсьмешкі пры гэтым.

. . .

Найлепшая палітыка — сапраўднае мастацтва.

. . .

Палітыкі — гэта людзі, якія рэалізуюць уласны інтарэс, прыкрываючыся папулярнымі лёзунгамі. Расчараваныя ў палітыцы — гэта тыя, хто не патрапіў рэалізаваць свой інтарэс праз палітыку. Яны і аб'ядноўваюцца на падставе супадзеньня асабістых, а не палітычных інтарэсаў. У аснове палітычнага інтарэсу — інтарэс асабісты.

. . .

Мы падманваем сябе, калі кажам, што трэба ўмець складанае патлумачыць народу проста. Ня трэба тлумачыць. Трэба простымі сродкамі дамагацца ад яго складанага.

. . .

У чалавечых і палітычных канфліктах не бывае тупіковых сытуацыяў. Бывае тупая і нахабная няўступлівасьць таго з бакоў, які моцны. Вось і ўвесь тупік.

# VITA PATRIAE

. . .

Памылкова думаць, што Беларусь важнейшая за Бога.

. . .

Як ня ўсе вернікі — хрысьціяне, гэтак і ня ўсе беларусы — ліцьвіны.

. . .

Беларускую справу пачынаюць і робяць адны, а ўзначальваюць і вядуць далей — абыякавыя да яе.

. . .

У Беларусі ня ўмеюць хваліць сваіх.

. . .

Грошы рухаюць людзьмі. Для посьпеху беларушчыны патрэбна было б як мага болей грашовых месцаў.

. . .

Беларусы любяць жыць. Гэта — натуральная прычына калябарацыі. Заходнерусізм, саветызм і палянізацыя — ня больш чым формы калябарацыі тых, хто хацеў добра жыць, "людзьмі звацца". Да таго ж, рацыянальныя ня ў прыклад ра-

сейцам ці яшчэ якім зацятым героям, беларусы выбіраюць самы просты і кароткі шлях “назвацца чалавекам”. Пры гэтым “людзьмі звацца” беларусы хочуць так моцна, што ў калябаранцкім запале не заўважаюць, як пераходзяць мяжу дазволенага і пачынаюць зьнішчаць сваю тоеснасьць, а часам і проста нішчаць сябе. Гэта азначае і тое, што беларусаў вельмі проста прымусіць калябараваць і са сваёй уласнай дзяржавай, калі такая зьявіцца. А пра мову і мовы няма... Адзінае, што кожная новая замежная калябарацыя памяншае шанцы беларусаў на сваю дзяржаву. Шкада, што можа і не давядзецца ўбачыць самакалябарацыі беларусаў... Добра было б паглядзець і пасьмяяцца.

Маралісцкі закід клясыку і роднаму народу: звацца лёгка, цяжэй быць...

• • •

Ёсьць дурныя народы. Яны паўстаюць супраць захопнікаў і гінуць. Ёсьць разумнейшыя. Яны аказваюць захопнікам ціхі супраціў. Напрыклад, не купляюць ягоныя тавары альбо перастаўляюць указальнікі на дарогах, як чэхі. А ёсьць і зусім мондрыя ад нараджэньня народы, як беларускі народ. Яму ўсё роўна, з кім

калябараваць, то бок супрацоўнічаць, — са сваімі, з чужымі... Кожнаму чужому ён робіцца сваім, бо хоча “людзьмі звацца”.

А паколькі быць цяжка, лягчэй звацца, дык таму толькі ў нас і можна звацца палякам, ня ведаючы польскай мовы, альбо расейцам — ня ведаючы расейскай. І гэта абнадзейвае. Бо звацца — яшчэ ня быць.

...

Божа, Божа! Нашто ты спаслаў столькім людзям у Беларусі пакутлівае пачуцьцё несвоечасовасьці іхнага таленту? Усім гэтым прадстаўнікам урбаністычнай культуры неіснуючага беларускага гораду — пісьменьнікам без чытачоў, журналістам без аўдыторыі, палітыкам бяз выбаршчыкаў, сьпевакам невядомых беларускіх корчмаў і шынкоў, нацыянальным бізнэсмэнам няіснай беларускай нацыі... Ты не пакінуў бяз справы толькі ейных няісных змагароў... Несвоечасовай Беларусі да часу — цуд.

...

Беларусы такія маўклівыя, відаць, таму, што ўсё жыцьцё іхнае начальства гаворыць зь імі на чужых мовах. І таму,

каб зразумець “паночкаў”, трэба менш гаварыць, а болей услухоўвацца...

...

Праблема беларусаў ня ў тым, што мала могуць, але ў тым, што мала хочуць. А хто мала хоча, той мала й мае.

...

Беларусам не хапае да таго, як трэба.

...

І ў сёньняшняй Беларусі мужыкі і шляхта адрозьніваюцца. Шляхта — больш хуткая і шырокая, а мужыкі — больш вузкія і працавітыя.

...

Беларускі мужык + праваслаўе з кірылкаю = западнорусизм.

...

Некаторыя нашыя змагары за грамадзянскую супольнасьць і многія іх памагатыя зь ліку інтэлігенцыі не разумеюць, што грамадзкай маралі не бывае без маралі асабістай.

...

Некаторыя кажуць, што любяць Бе-

ларусь і ня любяць беларусаў. Мне карціць сказаць інакш. Я люблю беларусаў і... не люблю беларусаў.

. . .

Эўропа ў Беларусі загнаная пад спуд.

. . .

У Беларусі час ідзе, а Беларусь у часе — не.

. . .

Галоўнае правіла мудрага правіцеля, пісаў Вавэнарг, — кіравацца пануючымі настроямі. Вавэнарг не памыліўся, бо быў французам. Ён памыліўся б, каб быў беларусам.

. . .

Беларусь усё болей робіцца марай. Не таму, што самая лепшая, але таму, што нязьдзейсьненая...

## VITA VICINORUM

. . .

Улічваючы агульную гісторыю і сёньняшні стан рэчаў, расейцаў і палякаў беларусы маглі б называць стрыечнымі братамі, украінцаў — братамі роднымі, літоўцаў — сваякамі і колішнімі суседзямі па камуналцы, а латышоў — сваякамі далёкімі.

. . .

Немцы маглі б больш дапамагаць беларусам, каб ведалі якім прыкладам для пераймальня ў сярэднявечнай Беларусі яны былі.

. . .

Густ і мера ня надта любілі старую Расею, а новая — ня надта любіць іх.

. . .

Стыль расейцаў — нізкі, а беларусы сёньня эклектыкі.

. . .

На мяжы другога і трэцяга тысячагодзьдзяў расейцы раптам зразумелі, што іх савецкае мінулае і яго мастацтва — таксама клясыка...

. . .

Раней у Расеі казалі “извольте”, а зараз кажуць “па жизни”...

## ЭЎРОПА

. . .

Цывілізаваныя краіны адрозьніваюцца ад нецывілізаваных адсутнасьцю правінцыі.

. . .

Адны цікавяцца гісторыяй з мэтай “застацца ў ёй”, а іншых цікавіць іх асабістая гісторыя, зь якой яны хочуць мець як мага менш клопату і праблемаў. Другіх больш на Захадзе.

. . .

Чым далей на ўсход, тым больш пляскатыя дахі. А на Далёкім Усходзе ў іх нават куты загінаюцца ўгару.

. . .

Сапраўдныя эўропацэнтрысты памятаюць, што мудрасьць ёсьць і на Ўсходзе, а на Далёкім Усходзе — ёсьць Кітай.

. . .

Часам здаецца, што Эўропа яшчэ

толькі мае спазнаць тое, што Ўсход ужо спазнаў.

. . .

Цікава глядзець на японца з электрагітарай...

## ЭМІГРАЦЫЯ

. . .

Эміграцыю, галоўнае, каб нехта пачаў. Астатнім стане зайздросна...

. . .

Трагедыя палітычных эмігрантаў у тым, што яны спадзяюцца праз год-два вярнуцца, але атрымоўваецца, што ад'яжджаюць назаўсёды. Бо на Радзіме нічога не мяняецца...

. . .

На эміграцыі хочацца дадому, а ўдома — на эміграцыю.

. . .

"Мы яшчэ прыедзем, і вам давядзецца вывучыць нашую мову..."

. . .

Добра, што цэлы народ ня можа эміг-

равацъ, і што на радзіме заўсёды нехта застаецца...

## БЕДНАСЬЦЬ І БАГАЦЬЦЕ

...

Хоць і кажуць, што беднасьць — не загана, але й тое, што яна спараджае заганы — праўда.

...

Дабрабыт, напісаў некалі Вавэнарг, надае асаблівую праніклівасьць здароваму сэнсу. Я зь ім пагаджуся, але дадам, што, на жаль, здаровы сэнс асабліва абвастраецца пасьля страты дабрабыту.

...

Багацьце і перасычанасьць клічуць да жыцьця гурманства. Амараў ядуць тыя, каму катлета ўжо ў горла ня лезе.

...

Той, каму не стае хлеба, ня дбае пра прыправу да мяса.

## ХАЛУЙСТВА

. . .

Халуйства дапамагае выгадаваць у сабе будучага гаспадара. На жаль ці на шчасьце.

. . .

Якая розьніца паміж халуйствам і калябарацыяй? Хіба, халуйства — генэтычнае, а калябаранцтва — сьвядомае, разумовае, бо дазваляе гаспадара выбраць. Зрэшты, гаспадар усё роўна прыходзіць сам.

. . .

Служыць можа ня толькі халуй. Галоўнае — інтэнцыя. Жаданьне халуя — дагадзіць. Жаданьне годнага — рэалізаваць свае перакананьні і спадзевы праз службу.

. . .

Шукаеш свайго халуя? Паглядзі ў люстра.

. . .

Халуй павінен ведаць, што ёсьць уласнасьцю не гаспадара, але ягонага становішча ці пасады — наступнаму можна й не спадабацца.

## ПРЫМУС

. . .

Нават і няўступлівыя саступаюць. Бывае, несьвядома, але часьцей — пад прымусам.

. . .

Адсутнасьць прымусу азначала б для чалавечай цывілізацыі катастрофу. Прымус у розных яго формах — фактар прагрэсу. Супраць прымусу могуць выступаць тыя, хто не разумее ягонае ролі ў стрымваньні нізкага і злога.

. . .

Прымус можа спарадзіць дасканаласьць, а можа — і хаос.

. . .

У разумных грамадзтвах прымус павінен быць мяккім, гнуткім і закамуфляваным.

. . .

Прымус неадрыўны ад свабоды — ён, бывае, яе забясьпечвае.

## КАМПРАМІС

. . .

Кожны станоўчы вынік — плён кампрамісу. Бескампрамісная — няўдача.

. . .

Ставаючы на дарогу кампрамісаў, трэба памятаць, што другая яе палова называецца шляхам згодніцтва.

. . .

Кажуць, сутыкненьне законных інтарэсаў можна разьвязаць з дапамогаю кампрамісу. Хіба — не. Які тут кампраміс, калі ўжо — сутыкненьне? Далей — перамога і параза. Кампраміс можа дапамагчы законным інтарэсам не сутыкнуцца. Але паколькі ў жыцьці інтарэсы сутыкаюцца ўсё роўна і аб'ектыўна, кампраміс — гэта значыць, узаемная саступка — часта апынаецца непатрэбным. У жыцьці саступае альбо прайграе адзін.

. . .

Кампраміс дапамагае лавіраваць паміж амбітнымі людзьмі.

Але, калі ёсьць сіла — скінь з дарогі амбітнага. Хай вучыцца кампрамісу.

. . .

Кампраміс амаль заўсёды патрэбны, але вельмі часта — несвоечасовы.

. . .

Саступаць трэба так, каб пасьля не шкадаваць.

## ДАБРАЧЫННАСЬЦЬ

. . .

Ці ёсьць межы дабрадзейнасьці? Ёсьць, і розныя. У адным выпадку, гэта памер вашага сэрца, у другім — памер кішэні...

## СВАБОДА І НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ

. . .

Самая небясьпечная залежнасьць — залежнасьць ад уласных жаданьняў.

. . .

Незалежнасьць — гэта ўсьвядомленая залежнасьць.

. . .

Залежаць — больш камфортна.

. . .

Прайграюць тыя, хто спадзяецца на іншых.

. . .

Нам ня дадзена быць незалежнымі. Але дадзена да незалежнасьці імкнуцца.

. . .

Чалавек мог бы быць сапраўды незалежным, калі б ня быў створаны Стваральнікам.

. . .

Калі нехта не залежыць ад вас, значыць, вы залежыце ад яго.

. . .

За падкрэсьлена незалежным выглядам амаль заўсёды хаваецца ўнутраная залежнасьць.

. . .

Усе мы лічым сябе незалежнымі і кіруемся толькі сваімі поглядамі. Пры гэтым мы забываем, што фармуемся пад уплывам іншых людзей.

. . .

Свабода — гэта магчымасьць выбару, а незалежнасьць — права выбару.

# VITA TACITA
## *маўклівае жыцьцё*

. . .

*1984-2002*

# ULTIMA RATIO
## *апошні аргумэнт*

* * *

Уведаўшы людзей, зразумеўшы іх і зьненавідзеўшы іх праз гэта, не застаецца больш нічога, як іх любіць...

## Індэкс паняткаў

адвольнае *157*
амбіцыя *100*
афарызм *173*
багацьце *205*
балбатня *54*
беднасьць *205*
вера *137*
ветлівасьць *94*
ворагі *30*
гасьціннасьць *94*
годнасьць *93*
гонар *93*
грамадзтва *183*
грошы *191*

грэх *137*
густ *178*
дабрачыннасьць *209*
дабро *143*
дурнота *88*
жанчына *102*
жыцьцё *9*
зайздрасьць *112*
здрада *50*
зло *143*
інтэлект *154*
кампраміс *208*
карысьлівасьць *131*
каханьне *32*
кнігі *180*
крывадушнасьць *122*
крыўда *56*
культура *180*
літаратура *164*
людзі *65*
лянота *107*
маладосьць *22*
мана *121*
мараліст *173*
мастацтва *164*
маўчаньне *54*
мера *178*

надзея *155*
наіў *51*
недасканаласьць *118*
незалежнасьць *209*
нікчэмнасьць *133*
няўдача *36*
няўдзячнасьць *116*
падступнасьць *125*
палітыка *194*
памылка *57*
пахвальба *134*
перамога *45*
подласьць *125*
помста *60*
посьпех *36*
праўда *52*
праца *191*
прыгажосьць *156*
прымус *207*
прэтэнзія *110*
расчараваньне *61*
рацыя *47*
розум *85*
самаацэнка *99*
самаўпэўненасьць *126*
свабода *209*
сіла *29*

сквапнасьць *128*
слабасьць *29*
славалюбства *134*
словы *177*
снабізм *135*
справа *189*
справядлівасьць *52*
старасьць *22*
сусьвет *152*
сьвет *152*
сьмеласьць *95*
сьмерць *62*
сябры *30*
сям'я *146*
талент *161*
удзячнасьць *116*
упартасьць *129*
упэўненасьць *126*
халуйства *206*
час *148*
шчасьце *46*
эгаізм *95*
эміграцыя *204*
Эўропа *203*

**Vostraja Brama**

У 1999-2004 г. выйшлі з друку кнігі:

**0. Адам Глёбус.**
**Постскрыптум.**
*Кантамінацыі*

**1. Васіль Быкаў.**
**Пахаджане.**
*Прыпавесьці*

**2. Славамір Адамовіч.**
**Плавільшчыкі расы.**
*Выбраныя вершы*

**3. Аляксандар Лукашук.**
**У фіялетавай ночы вугал крыла.**
*Дакумэнтальная проза*

**4. Зьміцер Бартосік.**
**Чорны пісталет.**
*Апавяданьні з уласнага жыцьця*

**5. Адам Глёбус.**
**Браслаўская стыгмата.**
*Апавяданьні*

**6. Сяргей Абламейка.**
***Ego*ізмы.**
*Канстатацыі*

**7. Уладзімер Арлоў.**
**Адкусі галаву вароне.**
*Падарожныя апавяданьні*



**Сяргей**
**АБЛАМЕЙКА**

Колькі арыгінальных думак зьяўляецца пасьля сямі-дзесяці чарак гарэлкі! Шкада, што раніцай іх ужо не прыгадаеш. Абламейку ж шанцуе: думкі прыходзяць да цьвярозага, ды яшчэ і тады, калі пад рукой аловак.

Сяргей Навумчык, Нью-Ёрк

"Дзіўная публікацыя Абламейкі... Спачатку геніяльны афарызм ("Каб навязаць людзям свае погляды, не абавязкова выказваць іх уголас"), пасьля нейкая бязглузьдзіца, а тады зноў нядрэнная сэнтэнцыя..."

Сяргей Дубавец, Вільня, зь ліста Андрэю Дыньку

Сяргей Абламейка выступаў экспэртам у Ватыкане ў справе навамучанікаў і бэатыфікацыі. Усім моцна пашанцавала, што яго не запрасілі ў камісію ў справах грэшнікаў.

Аляксандар Лукашук, Прага

"Ты столькі ўсяго зразумеў, а жывеш так, нібыта гэтага ня ведаеш..."

Павал Абламейка, Менск

СЯРГЕЙ АБЛАМЕЙКА

# EGOІЗМЫ

6